„Разьвіць узмоцненую работу па арганізацыйна- гаспадарчым умацаваньні калгасаў“ (ЦК УсеКП(б))

ТРАКТАРУ І СЯВЯРЦЫ—ПОУНУЮ НАГРУЗКУ

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мін. Гарэкому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 240 (4145)
ПЯТНІЦА 4 верасьня
1931 г.
Цана 2 капейкі
БЕСПЛАТНА.

СЯЎБА І ЗЯБЛІВА РАЗГОРТВАЮЦЦА МАРУДНА, ЗАСЕЯНА АЗІМЫХ 4 ПРОЦ. ПЛЯНУ, УЗОРАНА ЗЯБІ—1,3 ПРОЦ

КАПЫЛЬСКАЯ І СТАРА-ДАРОСКАЯ МТС ПРЫТРЫМЛІВАЮЦЦА ТЭОРЫІ „ЧАРГОВАСЬЦІ“ І ЗРЫВАЮЦЬ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ АСЕНЬНЯЙ С.-Г. КАМПАНІІ

Неадкладна давесьці пляны сяўбы і зяблівa да калгасаў і вёсак, скласьці насенныя фонды, накіраваць у калгасы машыны і ўгнаеньні са складаў райкаапсаюзаў

Да адказу апартуністаў са Слуцку, якія ня далі цьвёрдых заданьняў кулацка-заможным гаспадаркам па сяўбе і зяблеве.

Рыхтавацца да манэўраў

Набліжаецца час, калі часьці РСЧА, вкончыўшы летнюю вучобу, выйдуць у поле для замацаваньня, завяршэньня і праверкі набытых за год вайсковых навыкаў. Прадстаяць манэўры часьцей РСЧА. Манэўры ў бягучым годзе пройдуць у некалькі іншых умовах, чым у мінулыя гады. Вялізарныя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва, дасягнутыя пад кіраўніцтвам партыі ў галіне індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі стварылі ўмовы для яшчэ большага ўмацаваньня баяздольнасьці Чырвонай арміі. Грандыёзны працэс сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі знайшоў належны адбітак у справе аснашчэньня часьцей РСЧА тэхнічнымі сродкамі барацьбы. Чырвонаармейскія часьці ў гэтым годзе выйдуць на манэўры тэхнічна яшчэ больш насычанымі, з яшчэ больш падрыхтаваным начскладам, са значна ўзросшай баявой падрыхтоўкай і з павышанай палітычнай актыўнасьцю чырвонаармейскіх мас. Гэта дазваляе яшчэ больш паглыбіць праграму манэўраў, значна павышаючы патрабаваньні да начскладу, паліторганаў, партарганізацый і ўсёй чырвонаармейскай масы на манэўрах.

Гэтыя абставіны прад'яўляюць таксама павышаныя патрабаваньні мясцовым партарганізацыям і ўсёй савецкай грамадзкасьці ў справе іх падрыхтоўкі і ўдзелу ў манэўрах. Зразумела, што ў сучасных умовах посьпех арміі ў значнай ступені залежыць ад увагі і дапамогі тылу, ад правільнага ўзаемадзеяньня ўсіх арганізацый тылу з дзейнымі часьцямі для дасягненьня адзінай мэты.

Няма сумненьня, што ўвага і самае актыўнае падтрыманьне нашым чырвонаармейскім часьцям з боку шырокіх мас працоўных і ўсёй савецкай грамадзкасьці забясьпечаны. Аднак, ускладненыя абставіны ў сучасны пэрыяд павялічваюць адказнасьць усіх партыйных, савецкіх і грамадзкіх арганізацый за выкананьне тых задач, якія ўскладаюцца на іх у сувязі з манэўрамі. Неабходна выразна вызначыць, якія задачы і абавязкі ўскладаюцца на кожную арганізацыю, дакладна прадумаць аб найбольш мэтазгодным выкарыстаньні сіл і сродкаў і з усёй адказнасьцю загадзя падрыхтавацца да выкананьня надыходзячых задач, зьвязаных з манэўрамі.

Для савецкай грамадзкасьці Савецкай Беларусі ўдзел у манэўрах часьцей Чырвонай арміі — справа ня новая. Партыйныя, савецкія і грамадзкія арганізацыі, працоўныя масы БССР за апошнія гады прымалі актыўны ўдзел у манэўрах часьцей РСЧА, маюць багаты вопыт у справе арганізацыі і аказаньня рэальнай дапамогі манэўруючым часьцям. Працоўныя масы БССР, пад кіраўніцтвам партарганізацыі, праяўлялі вялікую ўвагу і клопаты аб манэўруючых часьцях і чырвонаармейскім складзе, акружалі чырвонаармейца ўвагай і прыхільнасьцю. Манэўры заўсёды ператвараліся ў дэманстрацыю адзінства волі працоўных БССР да абароны нашага сацыялістычнага будаўніцтва, супроць умяшаньня сусьветных імпэрыялістаў, супроць пасяганьняў на заваяваньні Кастрычніцкай рэвалюцыі. Манэўры выклікалі ўздым сярод рабочых, калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі, адзкачаліся новым уздымам выкананьня прамфінпляну і чарговых гаспадарча-палітычных кампаній на вёсцы.

Складаныя ўмовы манэўраў гэтага году патрабуюць, каб усе нашы арганізацыі ўлічылі вопыт мінулых манэўраў і загадзя поўнасьцю ўявілі сваё месца і ў справе максымальнай садзейнасьці арміі і ў справе непасрэднага ўдзелу ў манэўрах для ўпартай траніроўкі і вывучэньня баявых навыкаў часьцей Чырвонай арміі. Гэта ў сваю чаргу павінна быць улічана камандаваньнем іпаліторганамі вайсковых часьцей з тым, каб загадзя прадумаць аб найбольш мэтазгодным і максымальным выкарыстаньні мясцовых грамадзкіх арганізацый.

Неабходна разгарнуць шырокую растлумачальную работу сярод працоўнага насельніцтва для растлумачэньня ім задач і мэт манэўраў, асьвятленьня міжнароднага становішча Савецкага Саюзу для вайсковай і тэхнічнай прапаганды з тым, каб дабіцца далейшых рэальных вынікаў у справе ўзмацненьня вайсковай работы сярод грамадзянскага насельніцтва. Агітацыйна-масавая работа вакол манэўраў павінна быць шчыльна ўвязана з чарговымі гаспадарча-палітычнымі задачамі. Энтузіязм працоўных мас неабходна накіраваць на канкрэтную барацьбу за выкананьне прамфінпляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі, за бальшавіцкую сяўбу, за баявыя тэмпы скончэньня ўборкі ўраджаю і абмолоту, за своячасовае выкананьне і перавыкананьне пляну загатовак.

Манэўры неабходна будзе выкарыстаць для шырокага азнаямленьня чырвонаармейскіх мас з нашымі посьпехамі ў справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Паказаць гэтыя посьпехі на канкрэтных прыкладах нашых калгасаў і саўгасаў. Прахаджэньне часьцей РСЧА праз калгасы і саўгасы неабходна будзе выкарыстаць для шырокай справаздачнасьці кіраўніцтва калгасаў аб становішчы калгасу, яго посьпехах і труднасьцях. Змычка працоўнага насельніцтва з часьцямі РСЧА павінна выклікаць далейшы прыліў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы.

Пасьля манэўраў чырвонаармейскія часьці вернуцца на зімовыя кватэры. Гэта абавязвае мясцовыя савецкія, партыйныя і грамадзкія арганізацыі праверыць падрыхтаванасьць казарменых памяшканьняў да прыёму чырвонаармейцаў і прыняць усе меры і аказаць поўную садзейнасьць у справе хутчэйшага скончэньня рамонту. Выключнае значэньне набывае пытаньне паляпшэньня бытавых умоў для начальніцкага складу. Неабходна прыняць рашучыя меры па ліквідацыі бескватэрнасьці сярод начскладу, паляпшэньні каапэрацыйнага абслугоўваньня начальніцкага складу шляхам узмацненьня работы закрытых вайсковых разьмеркавальнікаў, палепшыць наяўныя і арганізаваць рад новых устаноў, якія паляпшаюць бытавыя ўмовы начальніцкага складу (сталоўкі, рамонтныя майстэрні і г. д.), з тым, каб стварыць начскладу адпаведныя бытавыя ўмовы для ўзьняцьця баявой падрыхтоўкі Чырвонай арміі.

Задача па забясьпячэньні манэўраў і нармальных умоў работы часьцям на зімовых кватэрах надзвычай адказная, і партарганізацыям сумесна з камандаваньнем і паліторганамі часьцей належыць выпрацаваць канкрэтны плян дзеяньняў і забясьпечыць яму баявыя бальшавіцкія тэмпы.

Пастанова ЦК КП(б)Б

I. Сакратарыят ЦК КП(б)Б, заслухаўшы паведамленьне інструктара ЦК, тав. Галодка і сакратара РК тав. Клютко аб ходзе ўборачнай кампаніі і калектывізацыі ў Бягомльскім раёне, адзначае, што, дзякуючы правільнаму правядзеньню генэральнай лініі партыі, райпартарганізацыя дабілася значных посьпехаў у справе сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі раёну (калектывізавана 76,5 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак раёну з ахватам пасеўнай плошчы да 82 проц. гэтым самым закончана ў асноўным суцэльная калектывізацыя, перавыкананы веснавы пасеўны плян на 2 проц. і пасеў тэхнічных культур у параўнаньні з мінулым годам павялічыўся на 50 проц., першымі ў БССР скончылі ўборку сенажаці і т. д.).

II. Адначасова з гэтым ЦК падкрэсьлівае і зварачае ўвагу РК і ячэек на тое, што арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў, сіласаваньне, мабілізацыя сродкаў, уборка яравых і ільну, а таксама будаўніцтва, камплектаваньне таварных фэрм і здача таварнай прадукцыі праходзіць зусім незадавальняюча.

III. Асабліва ЦК зварачае ўвагу партарганізацыі на тое, што ў апошні час партыйныя ячэйкі Бярэзкаўскага, Глінскага і Нядольскага сельсаветаў пад націскам кулацтва і яго дапаможнікаў у партыі — апартуністаў, дапусьцілі грубейшыя скрыўленьні партыйнай лініі, якія выразіліся ў прымусовасьці, адміністраваньні, замалоўваньні, масавых штрафах, дачы цьвёрдых заданьняў серадняком, пазбаўленьні сенажаці адпаасобнікаў, каб гэтым самым прымусіць уступіць іх у калгасы. Такім чынам апартуністы гэтых ячэек спаўзьлі са шляху барацьбы з кулаком на шлях барацьбы з серадняком і сваёй тактыкай прыраўнялі серадняка да кулака, самі ня ўбачылі сапраўднага кулака, притушылі клясавую пільнасьць мас, падрывалі наш саюз з серадняком і дапамагалі кулаку ў барацьбе з калгасным будаўніцтвам. Несвачасовае і недастатковае папярэджваньне партарганізацыі з боку РК КП(б)Б аб недапушчальні «лявацкіх» перагібаў, пагоні за дутымі процантамі ў калектывізацыі і права-апартуністычнага самацёку ў арганізацыі на гаспадарчым замацаваньні калгасаў, таксама ў сваю чаргу садзейнічала скрыўленьню лініі партыі з боку гэтых ячэек.

Выходзячы з вышэйадзначанага, ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1) Ухваліць прынятыя Бягомльскім РК КП(б)Б мерапрыемствы па барацьбе з «лявацкімі» перагібамі ў раёне, як: зьняцьце з работы сакратароў ячэек, старшынь Бярэзкаўскага, Глінскага, Асоўскага і Нядольскага сельсаветаў і прыцягненьне іх да адказнасьці, правядзеньне пашыранага пленуму РК для мабілізацыі ўвагі навакол зьніщэньня апартуністычнай практыкі і ліквідацыі спрарываў ва ўборачнай кампаніі, правядзеньне пленумаў сельсаветаў і сходаў усіх ячэек па пытаньні «лявацкіх» загібаў у калгасным будаўніцтве і падатковым абкладаньні і пасылку т. т. з раённага актыву для працы ў гэтыя сельсаветы і г. д.

Абавязаць РК у самы карацейшы тэрмін карэнным чынам выправіць памылкі і весьці гэту справу да канца.

2) Прапанаваць РК і ячэйкам узмацніць барацьбу з кулаком і яго дапаможнікамі — правымі і «левымі» апартуністамі, сканцентраваць галоўную ўвагу і сілы партыйнай, камсамольскай арганізацыі, калгасных і савецкіх устаноў па арганізацыйна-гаспадарчым узмацненьні калгасаў, для чаго неабходна:

а) дабіцца правільнай расстаноўкі сіл у калгасах, ліквідаваць абязьлічку ў карыстаньні інвэнтаром, машынамі і конямі, увесьці сапраўдную зьдзельшчыну ва ўсіх калгасах раёну, праводзіць улік працы кожнага калгасніка па якасьці і колькасьці ў працаднёх і ня менш як адзін раз у пяць дзён запісваць працадні ў працоўныя кніжкі;

б) правесьці шырокае растлумачэньне ва ўсіх калгасах і вёсках пастановы НКЗ і Калгасцэнтру аб парадку разьмеркаваньня даходаў у калгасах і вынічэньні зьявішча падлоцкага разьмеркаваньня хлебных авансаў і прамтавараў, падворнага разьмеркаваньня кармоў, праводзячы разьмеркаваньне ўсіх даходаў як грашовых, так і натуральных толькі ў адпаведнасьці з выпрацаванымі працаднямі;

в) падвоіць тэмпы і з бальшавіцкай упартасьцю закончыць уборку ільну яравых, правесьці азімую сяўбу, зяблеве ворыва і дабіцца хутчэйшага скончэньня будаўніцтва і ўкамплектаваньня таварных фэрм па 100 проц., выканаць плян сіласу і здачы таварнай прадукцыі дзяржаве, згодна пляну і тэрміну, разгортваючы шырокі мэтад сацспаборніцтва, ударніцтва, сустрэчных плянаў і ўзаемадапамогі, пасьпяховых адстючым у гэтай працы

на аснове добраахвотнасьці, не дапускаліся кулакі ў калгасы, прытрымліваецца таго, каб усе мерапрыемствы ў адносінах да кулацтва — дача цьвёрдых заданьняў, індывідуальнае абкладаньне — праводзілася пры самым актыўным удзеле калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас на падставе загадзя шырока праведзенай масавай растлумачальнай працы з боку ячэек і сельсаветаў, дабіваецца самых добрасуседзкіх адносін паміж калгасамі і аднаасобнікамі — беднякамі і сераднякамі.

4) ЦК папярэджвае арганізацыю, што дапушчэньне аслабленьня працы сярод аднаасобнікаў і асабліва сярод беднаты, як у калгасах, так і па-за калгасамі ні ў якім разе ня можа быць цярпіма, і праца сярод іх павінна ўзмацніцца, што і дапаможа арганізацыі хутчэй скончыць калектывізацыю раёну поўнасьцю і на гэтай падставе ліквідаваць кулацтва як клясу.

5) ЦК адзначае, што адной з рашаючых умоў пасьпяховага правядзеньня калектывізацыі і замацаваньня кампаніі і саўгасаў у раёне зьяўляецца рашучая перабудова партыйна-масавай працы ячэек у напрамку аперацыйнага канкрэтнага кіраўніцтва з боку РК і ўсіх раённых арганізацый, правільная расстаноўка партыйных сіл у калгасах з такім разьлікам, каб былі абслужаны, галоўным чынам брыгады, групы, калёны і г. д. і была узмоцнена вядучая роля кожнай парт'ячэйкі і кожнага камуніста ў паасобку.

75 проц. пляну зяблевага ворыва выканана

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА. Калгас «АНЗОР» 15 жніўня скончыў малацьбу азімых. У калгасе было своячасова падрыхтавана насеньне для асеньняй сяўбы і 20 жніўня першым у раёне прыступіў да асеньняй сяўбы.

Калгасьнікі абавязаліся скончыць сяўбу азімых да 5 верасьня. Побач з сяўбсю калгас узяўся зяблець. УЖО 75 ПРОЦ. ПЛЯНУ ЗЯБЛІВА ВЫКАНАНА.

За ўдарную работу па падрыхтоўцы да асеньняй сяўбы СТАРШЫНЯ КАЛГАСУ ПАБУДЗЕЙ («25-тысячнік») ТАНЕЖЫЦКАЙ МТС ПРЭМІЯВАНЫ.

ЦЫРЛІН.

ПАНЧОШНАЯ ПУШЧАНА

ПРЫВІТАНЬНЕ САЎНАРКОМУ БССР

ВІЦЕБСК, ПАНЧОШНАЙ ФАБРЫЦЫ

Вітаю рабочых, інжынэрна-тэхнічны і адміністрацыйны пэрсанал з пускам новай фабрыкі, з новай перамогай пралетарыяту на фронце індустрыялізацыі краіны. Спадзяюся, што вы будзеце пераможцамі і ў адносінах выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну ў колькасных і якасных паказальніках.

Нам, Старшыні Савету Народных Камісараў БССР Г. Грысюк.

3 верасьня, 1931 году.

Раньні пасеў пад ударам

СЛУЦАК. (Наш кар.). Слуцкі раён павінен у гэтым годзе засеяць 23.900 гэкт. азімны.

Становішча-ж з падрыхтоўкай да сяўбы прымушае біць трывогу. На 27 жніўня калгасамі падрыхтавана пад засеўня больш 30 проц. ворыва. Па асобных калгасах становішча яшчэ больш пагражаючае. Калгас «Чырвоная ніва» падрыхтаваў толькі 3 гэкт., пры пляне сяўбы ў 119 гэкт. Ня лепшае становішча і ў калгасах: «Хорашава», «Працаўнік», «Жаліцы», «Селяніч» і інш. У калгасе «Хорашава» строга захоўваецца чарга: «Трэба ўборку скончыць, а тады ўжо сеяць»—заявіў працаўнік гэтага калгасу на нарадзе старшынь калгасаў.

Пляны сяўбы да вёсак, насьлішч і аднаасобных двароў яшчэ не даведзены. Кулацка-заможным гаспадаркам ня даны цьвёрдыя заданьні па сяўбе.

Зусім не распачалася ачыстка насеньня. Рад калгасаў не забясьпечан збожжаачышчальнымі машынамі і ў гэты-ж самы час склады райкаапсаюзу загружаны імі. Ні адна тона насеньня не пратручана. Не загатоўлен у выстарчальнай колькасьці фармалін для пратручваньня.

Таксама зусім не распачата вапнаваньне і тарфаваньне глебы. Некаторыя калгасы яшчэ да гэтага часу не завезьлі ні аднаго цэнтнэра вапны і торфу.

Зусім недапушчальна, калі Слуцкая МТС пляцецца ў хвасьце падрыхтоўкі да сяўбы. Глеба не падрыхтавана. Насеньне ў калгасах, якія абслугоўвае МТС, не абменена і штучнае ўгнаеньне не завезена. Трактарны парк ня прыведзен у баявую гатоўнасьць. З 30 трактараў, якія працуюць, штодня ў рамонт ідзе 4 трактары. Рамонт дробны і пры большай стараннасьці яго можна зжыць.

Райвыканком і райкалгасаюз надта мала ўвагі аддаюць падрыхтоўцы да асеньняй сяўбы.

П. АРЦЕЛЬНЫ і Я ЖЫЛКА.

КОЖНУЮ МАШЫНУ—У СТРОЙ

ДУБРОЎНА. Белсаўгастрэст прыслаў саўгасу Станіслава 3 радковых трактарных сявяркі, а саўгасу патрэбна толькі адна.

Сявяркі валяюцца на дваре, іржавеюць. У гэты час у калгасах недахоп сявярак.

ЧАРНЯЎСКІ.

„Мы заняты ўборкай“

КАПЫЛЬ. Зяблеве ворыва, як адзін з вагароў узьняцьця ўраджайнасьці, зьяўляецца адсталым участкам Капыльскай МТС. Паводле пляну, МТС павінна падняць 8.000 гэкт. пад зяблева, з іх 4.000 гэкт. цаліны. На 25 жніўня ўзьнята толькі 369 гэкт.—4,6 проц.

Такія чарапашыя тэмпы зяблевага ворыва тлумачацца апартуністычнай недаацэнкай яго з боку кіраўнікоў МТС. Работнікі МТС тлумачаць гэта тым: «Мы заняты ўборнай ураджаю».

Трэба зламаць апартуністычныя адносіны да зяблева і пераключыць 80 проц. трактарнага парку на зяблеве ворыва.

ВАРЭВАЦКІ.

ЗА 5 ДЗЕН—80 ГЭКТАР

БРАГІН. Калгас «Добраахвотнік» на 20 жніўня скончыў уборку яравых. 26 скончана ўборка, замочка і расьсьціл ільну. Разгарнулася сяўба жыта. За 5 дзён засеяна 80 гэкт.

Баскін.

Улік працы забясьпечыў посьпех уборачнай

Па Капыльскім раёне ўборка сенажаці і азімых скончана.

Усяго па раёне скошана і ўбрана: сенажаці — 9.370 гэкт., канюшыны — 1.695 гэкт., азімых — 2.659 гэкт. Прыступілі да ўборкі яравых і на сёньняшні дзень убрана 30 проц. пляну.

Капыльскі раён дабіўся перамог у справе правядзеньня ўборачнай кампаніі, дзякуючы таму, што своячасова завастрыў увагу на зьдзельшчыне. Усе палявыя работы праводзіліся на аснове зьдзельшчыны. З 156 калгасаў раёну—138 перайшлі на зьдзельшчыну, 132 калгасы выдалі калгасьнікам працоўныя кніжкі і 125 калгасаў вядуць рэгулярна запіс працадзён.

Некаторыя калгасы прыступілі да малацьбы жыта і раньніх яравых. Тут-жа пасьля малацьбы вядзецца і адсыпка збожжа для здачы дзяржаве.

Калгас «Зара свабоды», абмалаціўшы жыта, арганізаваў чырвоны абоз для дастаўкі 200 пуд. збожжа на ссыпны пункт.

М.

Бабруйск не падрыхтаваўся да сяўбы

БАБРУЙСК. 2. (БЕЛТА). Падрыхтоўка да асеньняй сяўбы па Бабруйскім раёне праходзіць слаба. Плянавае заданьне па ворыве папару на 30 жніўня калгасамі выканана на 49 проц., аднаасобным сэктарам—на 54,4 проц. Калгасы ачысьцілі насеньня толькі 22 проц., аднаасобнікі—15,4 проц.

Калгасы ня ў поўнай меры забясьпечаны с.-г. машынамі і штучным угнаеньнем. У некаторых калгасах з-за недахвату малатарань затрымліваецца засышка насенных фондаў.

Зяблеве ворыва калгасы выканалі толькі на 5,6 проц., аднаасобнікі—яшчэ менш—2,6 проц.

Усё гэта тлумачыцца, галоўным чынам, нядуменьнем правільна расставіць сілы, слабым увядзеньнем зьдзельшчыны і адсутнасьцю сацыялістычных форм працы—спаборніцтва і ўдарніцтва. Толькі 50 проц. калгасаў пераведзены на зьдзельшчыну, ды і гэта ліцба ня зусім правільная, бо шмат якія калгасы перашлі на зьдзельшчыну толькі фармальна. Працоўнымі кніжкамі забясьпечана ўсяго 25 проц. калгасаў.

Райза і райкалгасаюз не забясьпечваюць уборкі ўраджаю апэрацыйным кіраўніцтвам і спасылаецца на «аб'ектыўныя» прычыны і недахват рабочай сілы ў калгасах.

Трактары не нагружаны, а папар не падняты

СТАРЫЯ ДАРОГІ. Стара-Дароская МТС зрывае падрыхтоўку да асеньняй сяўбы. Замест 2.300 гэкт. папару паводле пляну, МТС падрыхтавала толькі 420 гэкт. У гэты-ж самы час трактары поўнасьцю не нагружаны. Ёсьць выпадкі, калі трактары працуюць не 21 гадзіну ў суткі, а 5-7.

Трэба ліквідаваць прарыў. Да 5 верасьня сяўба ў раёне павінна скончыцца.

П. Харытановіч.

Пляны зяблева толькі пачалі рассылаць

ЖЛОБІН. Пляны зяблева, ворыва да гэтага часу не даведзены да вёсак і калгасаў. Толькі 1 верасьня пляны пачалі рассылацца раёнам па сельсаветах. Такім чынам, далёкія сельсаветы гэтыя пляны атрымаюць не раней 7 верасьня.

У. Машніцкі.

Сяўба не пачата

КРУПКІ. Абноўленае партыйнае і раённае кіраўніцтва Крупскага раёну пераключылася на барацьбу па ліквідацыі тых прарываў, якія былі зроблены старым апартуністычным кіраўніцтвам. Калектывізацыя за апошнія 2 дэкады ўзрасла з 38 проц. да 45 проц.

Але-ж яшчэ ня ўсе раённыя арганізацыі (райкалгасаюз і райкаапсаюз) і сельсаветы ўзяліся за працу па-баявому. Даныя аб ходзе ўборкі, сіласаваньні, пасеўнай кампаніі з поўнай яснасьцю сьведчаць аб гэтым.

Уборка яравых выканана толькі на 65 процантаў, ільну на 60 проц. Асабліва ганебны прарыў у сіласаваньні. Будаўніцтва ям і траншэй выканана на 29 процантаў, плян на закладку сілосу выканан на 2,9 проц.

Сяўба азімых у раёне яшчэ не пачата. Райкаапсаюз злачынна затрымлівае машыны і ўгнаеньні на сваіх складах. На складзе райкаапсаюзу ляжыць 150 тон угнаеньня, борапны «Зіг-Заг» не выдаюцца калгасам, бо яшчэ няма расцэнкі, цолы год стаіць 10 трыераў. Усе гэтыя машыны і ўгнаеньні вельмі патрэбны для пасеўнай кампаніі і калгасы адчуваюць у іх недахват.

Абноўленаму партыйнаму кіраўніцтву трэба рашуча ўзяцца за перабудову працы раённых устаноў (райкалгасаюзу і райкаапсаюзу).

А. Мор.

Страшынскі сельсавет атрымаў „ордэн“ чарапахі

ЖЛОБІН. (БелТА). У конкурс на лепшае правядзеньне ўборачнай кампаніі і ўвядзеньне зьдзельшчыны ў калгасах, Малеўскі сельсавет, які ў асноўным завяршыў суцэльную калектывізацыю атрымаў першы пераходны сьцяг РВК.

Калгас імя «11-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі» за сапраўднае ўвядзеньне зьдзельшчыны і дакладную пастаноўку ўліку працы, і пасьпяховае правядзеньне ўборачнай кампаніі атрымаў другі пераходны сьцяг РВК.

Страшынскі сельсавет за ганебныя тэмпы ва ўсіх гаспадарча-палітычных кампаніях атрымаў пераходны «ордэн» чарапахі.

Калгасьніцы Смалявіцкага раёну за ўборнай ільну.

Адтэрмінаваньне сяўбы азімых і зяблева—удар па ўраджайнасьці

Першы кантрольны тэрмін выкананьня пляну ня ўжо прайшоў. Тэмпы сяўбы азімых і зяблева ворыва выклікаюць сур'ёзную трывогу.

Да 10-га верасьня павінна быць заселена 1.324.487 гэкт. Між тым на 1 верасьня засеяна толькі 53.025 гэкт. — 4 проц. пляну асеньняй сяўбы.

Паўночныя раёны, паводле пастановы ўраду да першага верасьня поўнасьцю павінны былі скончыць сяўбу азімых. Заданьне ўраду паўночнымі раёнамі ня выканана. Так, ВІЦЕБСКІ, ВУШАЦКІ, ЧАШНІЦКІ, РАСОНСКІ і іншыя паўночныя раёны да 1-га верасьня не засеялі ніводнага гэктара.

З боку раду раёнаў наглядаецца апартуністычная недаацэнка вялізарнага значэньня выкананьня пляну сяўбы азімых у вызначаныя ўрадам тэрміны. У БАБРУЙСКІМ, СЛУЦКІМ і іншых раёнах дагэтуль яшчэ ня скончана давядзеньне пляну асеньняй сяўбы да асобных калгасаў і вёсак, ня даны цьвёрдыя заданьні кулацка-заможным гаспадаркам.

У хвасьце выкананьня пляну сяўбы азімых цягнуцца і МТС, якія на 1 верасьня выканалі толькі 7,7 проц. пляну сяўбы азімых.

Ня лепш праходзіць і зяблеве ворыва.

Сёлета павінна быць зазяблена 1.670 тыс. гэкт., з якіх 15 проц. павінна быць узьнята да 1-га верасьня. Між тым на 1-га верасьня ўзарана толькі 30.416 гэкт. — 1,3 проц. пляну.

Звыш 30 раёнаў да 1-га верасьня не прыступілі да зяблевага ворыва.

Пастанова Калгасцэнтру СССР яснасьведчыць аб недапушчальнасьці адтэрмінаваньня зяблевага ворыва да канцу ўборкі і асеньняй сяўбы. Гэта пастанова большасьцю раёнаў у жыцьцё не праводзіцца. Наглядаецца імкненьне адтэрмінаваць зяблеве ворыва да скончэньня ўсіх палявых работ. Так, Стара-Дароская і Капыльская МТС лічаць, што пакуль яны заняты ўборнай, яны не могуць заняцца ворывам.

Адзінай прычынай недапушчальных тэмпаў сяўбы азімых і зяблевага ворыва зьяўляецца няправільная арганізацыя працы, дрэнная расстаноўка сіл і нерацыянальнае выкарыстаньне цягловай сілы, трактары і сявяркі ў радзе моц прастойваюць і нерацыянальна скары стоўваюцца.

Канчатковае зьнішчэньне абязьлічкі, поўнае правядзеньне зьдзельшчыны, разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва зьяўляюцца асноўнымі вагарамі, якія вырашаюць посьпех сяўбы азімых і зяблевага ворыва.

Праграма азімай сяўбы і зяблевага ворыва павінна быць поўнасьцю і ў тэрмін выканана. Раёны павінны тэрмінова пераключыцца на новыя мэтады працы, ліквідуючы абязьлічку, умацняючы зьдзельшчыну, дабіцца 100 проц. выкананьня пляну асеньняй сяўбы і зяблевага ворыва.

Пакпасьці канец апартуністычнай бязьдзейнасьці раду раённых арганізацый, даць цьвёрдыя заданьні па сяўбе і зяблеве кулацка-заможным гаспадаркам.

46,8 проц. гаспадарак у калгасах

ПАВОДЛЕ ВЕСТАК НАРКАМЗЕМУ БССР НА 30 ЖНІЎНЯ Ў КАЛГАСАХ АБ'ЯДНАНА 360.930 БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК, ШТО СКЛАДАЕ 46,6 ПРОЦ. КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ ЎСЁЙ РЭСПУБЛІКІ.

27 РАЁНАЎ КАЛЕКТЫВІЗАВАНЫ ЗВЫШ 50 ПРОЦ.

РАЁНЫ ГЭТЫЯ НАСТУПНЫЯ: КОЙДАНАЎСКІ — 93 ПРОЦ., ЛЕПЕЛЬСКІ — 82,7, КЛІМАВІЦКІ — 80,5, КАСЬЦЮКОВІЦКІ — 71,4, БЯГОМЛЬСКІ — 70,8, ТАЛАЧЫНСКІ — 69,2, ЧЭРЫКАЎСКІ — 68,4, МСЬЦІСЛАЎСКІ — 67,8, КРЫЧАЎСКІ — 65,5, МЕНСКІ — 65,7, СЕНЬНЕНСКІ — 65,3, ВІЦЕБСКІ—61,9, ЧАШНІЦКІ — 60,2, ЛЁЗЬНЯНСКІ — 60, АРШАНСКІ — 59,1, СІРОЦІНСКІ — 58,3, ДРЫСЕНСКІ — 57,8, ШКЛОЎСКІ — 57,7, КАПЫЛЬСКІ — 57,6, ПОЛАЦКІ — 57,6, ПРАПОЙСКІ — 57,5, ВУШАЦКІ — 57, ЗАСЛАЎСКІ — 52,9, ВУЗЬДЗЕНСКІ — 52,3, ГАРАДОЦКІ — 507, ГОРАЦКІ — 50,1 І БЕШАНКОВІЦКІ — 50,1 проц.

ТРЫ РАЁНЫ КАЛЕКТЫВІЗАВАНЫ МЕНШ, ЯК НА 25 ПРОЦ. — ЦЕРАХАЎСКІ РАЁН КАЛЕКТЫВІЗАВАНЫ НА 23,7 ПРОЦ., БАБРУЙСКІ — НА 24,8 І ПЯТРЫКОЎСКІ — НА 24,9 ПРОЦ.

За сяўбою.

ДАНБАСУ—РАБОЧУЮ СІЛУ

СУСТРЭЧНЫЯ ЛІЧБЫ ВЯРБОЎКІ РАБСІЛЫ ДЛЯ ДАНБАСУ

ЗАМЕСТ 350 ДАМО 500 ГАРНЯКОЎ

Так адказалі касьцюковіцкія арганізацыі на заклік партыі

Паводле кантрольнай лічбы, атрыманай ад Наркампрацы, Касьцюковіцкі раён павінен быў завербаваць для Данбасу да 1 кастрычніка 350 гарнякоў. Атрымаўшы гэту кантрольную лічбу, Касьцюковіцкі райвыканком высунуў сустрэчны плян вярбоўкі рабсілы для Данбасу: завербаваць 500 гарнякоў да 25 верасьня.

Пастанова Касьцюковіцкага райвыканкому зьяўляецца сапраўды бальшавіцкім адказам на заклік партыі аб арганізаваным наборы рабсілы для Данбасу. Які з раёнаў першым пасьледуе гэтаму добраму прыкладу?

РАШАЮЧАЯ ЗАДАЧА

(З дакладу тав. КАРАНЕЎСКАГА)

Менская гарадзкая партарганізацыя сваёй бальшавіцкай работай забясьпечыла значныя посьпехі ў справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі прыгараднага раёну. Вызначныя лічбы давядзеньня калектывізацыі за час веснавой сяўбы да 60 проц. перавыкананы. Задачы па правядзеньні веснавой пасеўнай кампаніі выкананы ў асноўным здавальняюча. Дробная адпаасобная сельская гаспадарка ператвараецца ў буйную сацыялістычную на аснове саўгаснага і калгаснага будаўніцтва. Яе значэньне ў прыгарадным раёне ўзрастае. Ужо ў падыходзячым 1932 годзе прыгарадная гаспадарка раёну павінна забясьпечыць Менск поўнасьцю гародніной, бульбай і малаком, а таксама даставіць значную колькасьць мяса.

Зараз у рабоце партарганізацыі ў галіне сельскай гаспадаркі зьяўляюцца галоўнымі задачамі правядзеньне ўборкі і засеў азімага кліну. Разьвіцьцё жывёлагадоўлі павінна займаць неаслабную ўвагу. Між тым, калі ўборка азімых праведзена здавальняюча, да ўборкі яравых мясцовыя арганізацыі аслабілі некалькі сваю ўвагу. У радзе калгасаў і саўгасаў уборка праводзіцца вельмі марудными тэмпамі.

Яшчэ горш стаіць справа з разгортваньнем асеньняй сяўбы. Паводле пляну, у раёне трэба засеяць 19.640 гэкт. Гэта лічба невялікая. Наяўнасьць рабочай і цягавай сілы забясьпечвае пасьпяховае выкананьне пляну сяўбы ва ўстаноўлены тэрмін. Патрэбна толькі праільная арганізацыя працы, рашучая барацьба з нядбайнасьцю і апартуністычнай практыкай. Трэба адзначыць, што сымптомы зацяжні сяўбы, стварэньня прарываў ва ўборцы бульбы ўжо сям-там вызначаюцца. Кіраўніцтва раду калгасаў прытрымліваецца старадзедаўскіх укладаў — цягнуць сяўбу да «пакроў». Многія з іх спадзяюцца на дапамогу шэфскіх арганізацый, рабочых, школ і Чырвонай арміі. На гэта менш за ўсё трэба спадзявацца, бо сёлета ня можа быць таго, што ў мінулым, калі рабочыя кідалі працу на прадпрыемстве і хадзілі ў калгасы капаць бульбу. Нельга цярпець такога становішча, калі, напрыклад, у калгасе «Адраджэньне» (прыгарадны сельсавет) 50 проц. рабочай сілы ня выходзіла на работу, а на праполку туды насылалі людзей з гораду ў парадку грамадзкасьці. Ні ў адзін калгас на ўборку ня будуць пасылацца людзі з гораду. Будзе давацца дапамога рабочай сілай толькі саўгасам спажывецкай кааперацыі, у якіх вельмі вялікі недахват рабочай сілы. Што-ж датычыць дапамогі калгасам на лініі шэфства, дык гэткая павінна заключацца ў пасылцы брыгад для арганізацыйнай работы, для перадачы вопыту ў арганізацыі працы. З усякімі імкненьнямі адкласьці слёзу трэба рашуча змагацца, каб забясьпечыць бязмоўнае выкананьне пляну да 10 верасьня. Інакш можа стварыцца прарыў ва ўборцы бульбы і гародніны.

Задачы пасьпяховага правядзеньня ўборкі і асеньняй сяўбы вымагаюць ад партарганізацыі выразнай апэрацыйнай работы, правільнай арганізацыі працы, увядзеньня ва ўсіх калгасах поўнай зьдзельшчыны і дакладнага ўліку працадзён. На жаль, выстарчальнай арганізацыі працы мы ня маем яшчэ ня толькі ў радзе калгасаў, а нават і ў некаторых саўгасах. Напрыклад, у саўгасах «Тарасава» і «1 мая» яшчэ ня ўведзена зьдзельная праца. Гэтыя саўгасы не пераведзены на гаспадарчы разрахунак. Працоўная дысцыпліна сярод рабочых вельмі слабая. Такое становішча недапушчальна. Мы павінны дабівацца, каб кожны саўгас па ўзорнасьці вядзеньня гаспадаркі быў паказальным прыкладам для навукольных калгасаў.

Невыстарчальная ўвага паасобных праўленьняў калгасаў, кіраўніцтваў саўгасаў і парт'ячэек да арганізацыі працы дрэнна адбіваецца на разьвіцьці жывёлагадоўлі. У паасобных саўгасах і калгасах з гэтай прычыны наглядаецца вялікі адыход парасят. У іншых выпадках здыханьне парасят даходзіць да 50 проц. Гэта вынік злачынна-нядбайных адносін да арганізацыі догляду жывёлы, адсутнасьці мер папярэджаньня распаўсюджаньня заразных хвароб, адсутнасьці карантыну і інш. З такім злачынствам трэба рашуча пакончыць, выкрыўшы і прыцягнуўшы да суровай адказнасьці канкрэтных вінаватых.

Праблема кармовай базы стаіць перад намі ва ўсёй вострасьці. Трэба ва што-б там ні стала выканаць пляны сіласаваньня. Таксама не павінна быць піякага адкладу па завяршэньні пачатага ў гэтым годзе будаўніцтва скотных двароў і сьвінарнікаў. У гэтай справе патрэбна большая зацікаўленасьць і ініцыятыва мясцовых арганізацый.

Побач з правядзеньнем уборкі і асеньняй сяўбы партыйныя арганізацыі калгасаў і саўгасаў павінны забясьпечыць сваячасовы абмалот збожжа, здачу (продаж) дзяржаве лішкаў і падрыхтоўку да разьмеркаваньня прыбыткаў калгасаў. Малацьбу трэба поўнасьцю скончыць не пазьней 1 сьнежня, а да 15 студзеня цалкам скончыць разьмеркаваньне прыбыткаў.

Менскі прыгарадны раён, як калектывізаваны на 65,5 проц., набліжаецца да завяршэньня суцэльнай калектывізацыі. Мы павінны выкананць пастаўленую чэрвеньскім пленумам гаркому задачу — давесьці калектывізацыю ў раёне за час асеньняй сяўбы да 70 проц. Але трэба памятаць, што стрыжнёвай задачай зараз зьяўляецца гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Кожная парт'ячэйка павінна змагацца за лепшую калгасную гаспадарку, за правільную арганізацыю ў ёй працы, забясьпечваючы сваёй работай сапраўдны поўны перавод усіх галін працы на зьдзельшчыну, перавод працы па рэйкі сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Выкарчоўваючы ў рабоце праваапартуністычную практыку, якая мае месца ў паасобных ячэйках, калгасах і сельсаветах, трэба рашуча біць па «лявацкіх» перагібах. А такія факты скажэньня партыйнай лініі, факты адміністрацыйнага націску на адпаасобніка-серадняка ў паасобных сельсаветах маюць месца. У Каралішчанскім і Калодзішчанскім сельсаветах былі факты штучнага ператварэньня серадняка ў кулака, былі спробы абкласьці індывідуальна паасобных нават маламоцных сераднякоў і інш. Такая дзейнасьць толькі на руку клясаваму ворагу. Трэба ў бліжэйшы-ж час праверыць гэтыя факты і рашуча ўдарыць па перагібшчыках.

Задачы па выкананьні чарговых гаспадарчых кампаній складаныя і вельмі адказныя. Посьпех іх выкананьня будзе залежаць ад правільнай арганізацыі працы на мясцох, ад апэрацыйнасьці і гібкасьці работы раённых і мясцовых арганізацый, ад мабілізацыі мас на неаслабную барацьбу з кулацтвам і яго агентурай — правымі і «левымі» апартуністамі.

„Герой працы" чакае канкрэтнай дапамогі

Фабрыка больш стаіць, чым працуе

ТЭРМІНОВА ДАЦЬ ФАБРЫЦЫ РЭЙКІ, ГРУЗАВІКІ, ТРАКТАРЫ

ДОБРУШ. (Ад нашага спэцкора). Вось ужо тры кварталы, як фабрыка перажывае ліхаманкавыя дні. Не праходзіла дня, каб ня было доўгага прастою. Лічбы з пачатку году даюць нязвычайныя вынікі: **фабрыка больш стаяла, чым працавала.** У студзені стаяла 53,1 проц. рабочага часу, у лютым — 81,4 проц., у сакавіку — 66,9 проц., у красавіку—70,6 проц., у маі — 72,7 проц., у чэрвені — 56,8 і г.д. У выніку **замест 17 з лішкам тон паперы, фабрыка за першае паўгодзьдзе дала менш 5.000 тон.** Апошнія дні прынесьлі некаторае паляпшэньне, але ўсё-ж нязначнае. Напрыклад, першыя 22 дні жніўня машыны прастаялі **33,2 проц. рабочага часу.**



Добруш. Пагрузачная станцыя

Асноўная прычына прастояў — аб ёй пісалася многа — **перабої ў рабоце сілавых станцый.** Новая сілавая станцыя, пабудаваная па апошнім слове тэхнікі, зьвязаная з крыніцай апалу — торфазаводам 6-кілёмэтравай падвесной дарогай, **не забясьпечвае-ца ў выстарчальнай колькасьці кавалкавым і сухім торфам.** Работа зрываецца з-за адсутнасьці выстарчальных транспартных сродкаў для дастаўкі торфу **з вучасткаў здабычы і сушкі да пагрузачнай станцыі падвеснай дарогі.** Торфазавод мае толькі такую колькасьць вузкакалейных рэек, якое хапае на вывазку торфу **з аднаго месца.** Але паколькі тарфяныя кагаты надзвычайна раскіданы, запасу для вывазкі з аднаго месца хапае толькі **на некалькі дзён.** Потым трэба вузкакалейную дарогу перанесьці на іншае месца, праз некалькі дзён—на трэцяе месца і г. д. Недахват рэек не дае магчымасьці манэўраваць і падрыхтаваць вузкакалейную дарогу загадзя для вывазкі з другога вучастку. Такім чынам першае, што патрэбна фабрыцы, гэта **рэйкі—ня менш 200 тон.** І галоўнае гэтыя рэйкі патрэбны **зараз, неадкладна.** Кожны дзень пратэрмінаваньня пагражае поўным зрывам вывазкі торфу, значыцца, і **работы фабрыкі.**

Пасьля доўгіх клопатаў фабрыка дабілася параду на 108 тон рэек з мэталюргічнага заводу імя Рыкава ў Енакіеве (Данбас). Але тут яна сустрэлася з іншымі перашкодамі. Сьлепа выконваючы дырэктывы аб максымальным скарыстаньні водных шляхоў, беларуская кантора «Сталь» распарадзілася даставіць фабрыцы гэтыя рэйкі **водным шляхам.** Абсурднасьць гэтага распараджэньня відавочна, бо адзінай воднай сыстэмы, якая-б зьвязвала Енакіева з Добрушам, **няма.** У Енакіеве рэйкі павінны быць пагружаны ў вагоны, вагоны гэтыя даставлены ў Днепрапятроўск, там рэйкі павінны быць перагружаны на параходы, якія ідуць толькі да Кіева, у Кіеве яны павінны быць перагружаны на іншыя параходы, якія курсуюць па лініі Кіеў—Гомель. У Гомелі—разгрузка на прыстані, перавозка фурманкамі па адлегласьці 3 з паловай клм. ад станцыі, на станцыі зноў пагрузка ў вагоны і дастаўка ў Добруш (25 клм. ад Гомелю).

Зразумела, увесь гэты зьвілісты і цярністы шлях рэйкі пройдуць ня менш як за 2-3 месяцы (такія факты былі), і фабрыка атрымае патрэбныя ёй да зарэзу рэйкі ў пачатку зімы або нават увесну 1932 г.

На настойлівую просьбу кіраўніцтва фабрыкі — скасаваць распараджэньне аб дастаўцы рэек водным шляхам, беларуская кантора «Сталь» адказвае фармальнай спасылкай на пастановы вышэйшых органаў аб максымальным скарыстаньні воднага транспарту «асабліва пры адгрузцы з тых і на тыя станцыі, якія маюць бліжа прыстані» (!?).

Таму мы лічым абсалютна неабходным, каб беларуская кантора «Сталь» неадкладна дала распараджэньне заводу аб дастаўцы рэек для Добрушу **чыгуначным транспартам.** Інакш адказнасьць за прастої на фабрыцы цалкам ляжа на беларускую кантору «Сталь».

Апрача рэек фабрыцы патрэбны і абяцаныя дзьве аўта-грузавыя машыны (паўтарытонкі) з **Ніжагародзкага аўтазборачнага заводу.** Гэтыя машыны павінны быць адгружаны фарыцы неадкладна. Машыны павінны аказаць вялікую дапамогу ў справе падвозкі торфу да вузкакалейкі. Таксама патрэбны фабрыцы трактары (іх павінен даць Сталінградзкі завод).

Бяз рэек, аўта-машын і трактараў вывазка торфу будзе сарвана і новая сілавая станцыя будзе працаваць пастарому —са значнымі перабоямі.

24-га жніўня фабрыка атрымала паведамленьне украінскай канторы «Саюзпаперы» аб тым, што фарыка на верасень зусім выключана з нарадаў на каменны вугаль. Антрацыт яшчэ мае на фабрыцы выключнае значэньне. Пакуль новая сілавая станцыя, якая працуе на торфе, ня будзе працаваць **нармальна,** фабрыка прымушана карыстацца старой сілавой станцыяй, якая працуе на каменным вугалі. Выключэньне фабрыкі з ліку спажыўцоў вугалю хоць на адзін месяц пагражае фабрыцы поўным спыненьнем. І да гэтага часу фабрыка сыстэматычна не атрымлівае не нормы. Так, за тры месяцы — чэрвень, ліпень і жнівень — фабрыка не атрымала **215 вагонаў антрацыту,** што складае каля 50 проц. запараджанага. Нарэшце колькасьці антрацыту хопіць на некалькі дзён. **Трэба прыняць тэрміновыя меры для забясьпячэньня фабрыкі ў верасьні каменным вугалем у колькасьці хоць-бы старой месячнай нормы (167 вагонаў).**

Новае кіраўніцтва фабрыкі напружвае ўсе намаганьні, каб ліквідаваць шматлікія недахопы, якія засталіся ў спадчыну пасьля старога кіраўніцтва. Але без практычнай дапамогі ў забясьпячэньні фабрыкі самым неабходным, гэтыя намаганьні дадуць у выніку вельмі мала.

Праўдзін

АД РЭДАКЦЫІ. У сувязі з напружаным становішчам вывазкі торфу для Добрускай папяровай фабрыкі, рэдакцыя зьвярнулася з просьбай у СНК БССР дапамагчы фабрыцы хутчэй атрымаць вузка-калейныя рэйкі. СНК БССР прапанаваў Беларускай канторы «Стальзбыт» паскорыць дастаўку рэек. УЧОРА КАНТОРА «СТАЛЬЗБЫТ» ПАСЛАЛА ЗАВОДУ ІМЯ РЫКАВА (ЕНАКІЕВА) ТЭЛЕГРАМУ АБ ДАСТАЎЦЫ РЭЕК ДЛЯ ФАБРЫКІ «ГЕРОЙ ПРАЦЫ» ЯН ВОДНЫМ ШЛЯХАМ, А ЧЫГУНАЧНЫМ ТРАНСПАРТАМ

КАДРЫ

Горацкія ВНУ не перабудаваліся

АБЯЗЬЛІЧКА У ВУЧОБЕ І ПРАКТЫЦЫ. АДРЫЎ АД ВЫТВОРЧАСЬЦІ. САМАЦЁК У КАМПЛЕКТАВАНЬНІ

АДКАЗ НА ВЫКЛІК МЭДІНСТЫТУТУ ПАДМАЦАВАЦЬ САПРАЎДНАЙ КАРЭННАЙ ПЕРАБУДОВАЙ РАБОТЫ ПА НОВАМУ

АБЯЗЬЛІЧКА І УРАЎНІЛАЎКА— „ганаровыя грамадзянкі"

Ў сьценах горацкіх ВНУ

Гістарычная прамова тав. Сталіна, якая з найбольшай вострасьцю паставіла асноўныя рашаючыя пытаньні сацбудаўніцтва на сучасным этапе павінна быць пакладзена ў аснову работы і ВНУ.

У рабоце горацкіх ВНУ яшчэ дагэтуль панує самацёк, ураўнілаўка, абязьлічка, няўмелая расстаноўка сіл, безгаспадарчасьць, адрыў ад вытворчасьці.

Камплектаваньне ВНУ праходзіць самацёкам. Прымацаваных да інстытутаў, рабфакаў і курсаў ёсьць невялікая колькасьць. Не наладжана сувязь з прадпрыемствамі, калгасамі і саўгасамі.

Самацёк і безадказнасьць пануюць у вярбоўцы новых навуковых сіл, у падрыхтоўцы кадраў для кадраў і ў рабоце з выпускнікамі. Існуе тэндэнцыя не вербаваць зараз-жа ў патрэбнай колькасьці новыя навуковыя сілы, а перагружаць старых навуковых працаўнікоў. З другога боку трацяцца вялікія сродкі на запросы работнікаў на кароткі тэрмін. Інстытут сьвінагадоўлі ня мае выкладчыкаў па 7 дысцыплінах. Не хапае шмат выкладчыкаў па дыялект. матэрыялізме, палітэканоміі і інш.

Некаторыя навуковыя працаўнікі (як канстатуе рэзалюцыя сходу навуковых працаўнікоў), не аплачваліся чамусьці поўнасьцю за фактычны лік прапрацаваных па дысцыпліне імі гадзін у той час, калі існаўшая толькі па ведамасьці, а фактычна ня чыталася, дысцыпліна аграрнага заканадаўства аплачвалася поўнасьцю круглы год.

РОДНЫЯ СЁСТРЫ — АБЯЗЬЛІЧКА І УРАЎНІЛАЎКА — ПАЧЭСНЫЯ ГРАМАДЗЯНКІ Ў СЬЦЕНАХ ГОРАЦКІХ ВНУ. Розьніца ў аплаце асьпірантаў і асыстэнтаў, асыстэнтаў і дацэнтаў, дацэнтаў і прафэсароў зусім нязначная. Усе выконваюць аднолькавую працу. Вядуць групы незалежна адзін ад другога.

За якасьцю вучобы не наглядалі ні кіраўнікі катэдраў, ні дэканаты, ні навучальныя часткі, а адсюль рад скажэньняў у правядзеньні актыўнага мэтаду вучобы (шаблёнізацыя і непрыстасаваньне мэтадаў да канкрэтных умоў даных дысцыпліны курсу, факультэту. Абязьлічка ў студбрыгадах, ігнараваньне індывідуальнага ўліку ведаў і г. д.).

Нездавальняюча пастаўлена вытворчая практыка студэнцтва. Наглядаецца адрыў тэорыі ад практыкі, існуе абязьлічка ў аб'ектах практыкі. Студэнты выкарыстоўваюцца не па спэцыяльнасьці. Прычынай гэтаму зьяўляецца адсутнасьць пастаяннай сувязі з прадпрыемствамі, дзе студэнты ў большасьці адбываюць вытворчую практыку.

У галіне культурнага і матар'яльна-бытавога абслугоўваньня ігнаруюцца пастановы партыі і ўраду. Кааперацыя адмаўляецца выдаваць належныя прадукты для сталоўкі навуковых працаўнікоў. (хлеб і крупы). Закрытага разьмеркавальніка дагэтуль яшчэ няма.

Рэарганізацыя акадэміі праходзіць чарапашымі тэмпамі.

Сыгналы з Горак яшчэ раз сьведчаць аб тым, што большасьць ВНУ яшчэ не перабудавалі сваю работу па-новаму.

ГУРВІЧ, ДРОЗД.

Адказваем на выклік мэдінстытуту

Гэтымі днямі адбыўся сход Горацкай сэкцыі навуковых работнікаў. Сход заслухаў даклад аб прамове тав. Сталіна і абмеркаваў прапановы мэдінстытуту аб перабудове работы ВНУ.

— Сход канстатуе,—гаворыцца ў рэзалюцыі,—што адзначаныя ў прамове тав. Сталіна недахопы і перашкоды ў рабоце, як ураўнілаўка, абязьлічка, самацёк, няўмелая расстаноўка сіл, работа па-старому, адрыў ад вытворчасьці, безгаспадарчасьць, поўнасьцю маюць месца ў дзейнасьці горацкіх ВНУ і навукова-дасьледчых установах, а таксама ў рабоце СНП.

Вялікая цякучасьць студэнцтва ўпіраецца ў рад пытаньняў, як пастаноўка навучальнай справы, выяўленьне профілю спэца, бытавыя ўмовы студэнцтва — пытаньне дыфэрэнцыяцыі стыпэндый, дрэнная пастаноўка харчаваньня, становішча інтэрнатаў, культабслугоўваньне і г. д.

Сход прапануе бюро СНП вылучыць брыгаду для дэтальнага азнаямленьня з бытавымі ўмовамі студэнцтва і для выпрацоўкі разам з стударганізацыямі канкрэтных мерапрыемстваў паляпшэньня бытавога становішча студэнцтва.

Практыка мінулых гадоў засьведчыць аб невыстарчальным плянаваньні вучэбнай работы і асабліва нагрузкі навуковых работнікаў. Спачатку навучальнага году не вызначаецца фактычная нагрузка работнікаў, а значыць і аплата. Праведзенае с.-г. акадэміяй вызначэньне нагрузкі бяз уліку рэальнай магчымасьці выкананьня да канца навучальнага году аказалася папяровым, што прыводзіла да таго, што дысцыпліны па якіх на працягу году ня давя ні адной гадзіны, аплачваліся поўнасьцю, у той час калі некаторыя дысцыпліны не аплачваліся зусім.

Абязьлічка мае месца ў адносінах да лябараторыі, габінэту, батанічнага саду і г. д. Няма пэрсанальнай адказнасьці за гэту работу, адсутнічае пастаянны ўлік маемасьці. Адсюль і цэлы рад страт.

Выкарыстоўваньне спэцыяльных габінэтаў і лябараторый рознымі групамі не па прызначэньні прыводзіць таксама да абязьлічкі.

Зусім нездавальняючая пастаноўка вытворчай практыкі студэнцтва — адрыў тэорыі ад практыкі, абязьлічка ў аб'ектах практыкі. Студэнцтва на практыцы выкарыстоўваецца не па спэцыяльнасьці. ВНУ адарвана ад вытворчасьці. Няма прымацаваных саўгасаў і калгасаў, няма сувязі і шэфства над імі.

Сход лічыць неабходным правесьці ў жыцьцё аб'яднаньне інстытутаў буйной рагатай жывёлы, сьвінагадоўлі і прадзільных культур са сваімі вопытна-паказальнымі саўгасамі, стварэньне такім чынам, вучэбна-вытворчы камбінат.

Задача падрыхтоўкі кадраў для буйной сацыялістычнай сельскай гаспадаркі ня можа быць адарванай ад правядзеньня навукова-дасьледчай работы ВНУ. Таму неабходна абсталяваньне лябараторый на аснове апошніх дасягненьняў тэхнікі на аснове шчыльнай сувязі навуковай работы з вытворчасьцю.

Канстатуючы адрыў вучэбнай часткі ад дасьледчай справы, сход лічыць неабходным узмацніць непасрэдны ўдзел інстытутаў у кіраўніцтве дасьледчай справай, наладзіць увязку дасьледчай работы з адпаведнымі навуковымі станцыямі і інстытутамі.

Агульны сход лічыць няправільным ураўнальны падыход пры разьмеркаваньні сродкаў на камандыроўкі і прапануе бюро сэкцыі перагледзець гэта пытаньне.

У адносінах да старэйшых навуковых работнікаў сход падкрэсьлівае, што палажэньне, высунутае ў прамове тав. Сталіным аб пераломе сярод спэцыялістаў, мае сваё яркае адлюстраваньне і ва ўмовах горацкіх ВНУ. Разам з тым сход адзначае, што ў горацкай ВНУ мелі месца факты не даволі чулых адносін да старэйшых навуковых работнікаў, элементы нетаварыскай крытыкі ў адносінах больш блізкіх навуковых работнікаў, невыкарыстаньне ў патрэбнай мерэ іх навуковых ведаў і вопыту, падчас не падтрымліваласа ініцыятыва навуковых работнікаў. Неабходна таксама адзначыць цэлы рад фактаў, якія гавораць аб адсутнасьці таварыскай дапамогі з боку старэйшых навуковых работнікаў малодзейшым.

Агульны сход сэкцыі навуковых работнікаў зварачае ўвагу ўраду БССР і ЦК КП(б)Б на тое, што пастанова ЦК і ўраду аб паляпшэньні матар'яльнага становішча навуковых работнікаў ва ўмовах Горак не праводзіцца ў жыцьцё.

Пытаньню пераводу навучальных устаноў на гаспадарчы разрахунак дагэтуль не аддавалася ніякай увагі. Няма наладжанай справаздачнасьці, пэрсанальнай адказнасьці за тую ці іншую работу. Не прыступілі да распрацоўкі пытаньня аб ажыцьцяўленьні прынцыпу гаспадарчага разрахунку ў канкрэтных умовах кожнай ВНУ.

Сход лічыць неабходным у самы бліжэйшы час перабудаваць работу сэкцый на аснове задач, указаных тав. Сталіным наблізіўшы яе (работу сэкцый) да кожнага інстытуту. Мабілізаваць навуковых работнікаў на ажыцьцяўленьне вытворчых задач інстытутаў і лёзунгу аўладаньня тэхнікай.

Да гэтага часу не разгорнута ўдарніцтва, сацспаборніцтва, не наладжана кіраўніцтва гэтай работай. Неабходна перабудаваць работу так, каб сапраўдныя ўдарнікі былі выяўлены і прэміяваліся як навуковымі камандыроўкамі, так і іншымі відамі.

Барацьба за марксыцка-ленінскую мэтадалёгію павінна быць яшчэ больш завострана на сучасным этапе.

Агульны сход лічыць, што цяперашняе становішча работы сэкцый сьведчыць аб слабым разгортваньні самакрытыкі. Сход ставіць задачу перабудаваць работу сэкцый на аснове шырокага разгортваньня бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі.

Падтрымліваючы ініцыятыву мэдінстытуту, які высунуў канкрэтную праграму перабудовы работы ВНУ на аснове задач, указаных тав. Сталіным, агульны сход заклікае ўсіх навуковых работнікаў інстытутаў і дасьледчых устаноў падхапіць ініцыятыву мэдінстытуту і ў кожным з горацкіх інстытутаў распрацаваць у бліжэйшы час рад канкрэтных мерапрыемстваў, якія-б забясьпечылі перабудову работы па-новаму.

КАДРЫ

4 РАШАЮЧЫЯ МЕСЯЦЫ

КОЖНЫ ДЗЕНЬ, КОЖНУЮ ГАДЗІНУ

выкарыстаць для ліквідацыі прарываў

у выкананьні праграмы капітальнага будаўніцтва

НА ПЛЕНУМЕ ЦП САЮЗУ ПРАМЖЫЛБУДАЎНІЦТВА

Чарговы пленум ЦП саюзу рабочых Прамжылбудаўніцтва, які адкрыўся ў Менску 1-га верасьня, быў прысьвечаны двум асноўным пытаньням — выкананьню пляну прамысловага і жыльлёвага будаўніцтва ў БССР 1931 г. і перабудове прафработы.

У Беларусі будуецца значны атрад з калёны «516». Новабудоўлі ўступілі ў рашучы пэрыяд. Як-жа разгортваецца будаўніцтва? Гэтаму пытаньню была прысьвечана значная частка першага пасяджэньня.

Адзін з дакладчыкаў — дырэктар Белбудаб'яднаньня тав. Васэрман, прызнаў, што будаўнічыя арганізацыі сустрэлі сэзон у значнай ступені непадрыхтаванымі. У выніку плян будаўніцтва за першае паўгодзьдзе выкананы на 56,3 проц., а гадавы — на 23,7 проц.

— Бясспрэчна, — кажа тав. Васэрман, што на тэмпы будаўніцтва мелі ўплыў недастатковае забясьпячэньне будматар'яламі і недахват рабсілы. Але гэта зусім ня значыць, што паказанымі прычынамі можна тлумачыць вялізарныя прарывы на радзе пабудоў. І выпукляць іх на першы плян могуць толькі людзі, якія недаацэньваюць мясцовых рэсурсаў, людзі, якія ня здольны па-бальшавіцку змагацца за перамаганьне вузкіх месц.

Само разьмеркаваньне матар'ялаў ва многіх выпадках праводзілася плянуючымі арганізацыямі па прынцыпах ураўнілаўкі — «усім патропку», бяз уліку ўдарнасьці пабудоў. Некаторыя ўдарныя пабудовы, спадзяючыся, што яны ўсё атрымаюць, нічога не рабілі, каб мабілізаваць унутраныя рэсурсы і ў выніку апынуліся ў горшым становішчы, чым другарадныя пабудовы, якія сваячасова пакланаціліся аб загатоўцы матар'ялаў. На многіх пабудовах пабарбарску адносяцца да выкарыстаньня дэфіцытных матар'ялаў. На такіх работах, як кладка сьцен фундаманту, цэмэнт у значнай ступені можна было замяніць вапнай, але гэта ня робіцца. Не выкарыстоўваюцца і адходы будаўніцтва. Зусім мала аддаецца ўвагі мясцовым крыніцам матар'ялаў. Віцебскія арганізацыі завозяць вапну з Сімферопаля, Украіны, у той час, калі ў Віцебскім раёне ёсьць вялізарныя пакłады вапны. Дахавага жалеза не хапае, а 120 тыс. штук чарапіцы ляжыць бяз руху і іх ніхто на хоча браць.

Возьмем такое пытаньне, як забясьпячэньне будаўніцтва рабсілай. Па работах Белбудаб'яднаньня недахват рабсілы складае 52 проц. Вярбовачны апарат ня справіўся з работай. У адной і тэй-жа вёсцы сядзелі прадстаўнікі 10-12 арганізацый, якія ўзьбянчывалі цэны і займаліся пераманьваньнем рабсілы. На вярбоўку Белбудаб'яднаньне выдатковала каля 30 тыс. рублёў, але вынікі самыя нязначныя. Да арганізаванага лабору рабсілы, шляхам заключэньня дагавораў з калгасамі амаль не прыступілі. Але трэба падкрэсьліць, што па будаўнічых плянах б'е ня столькі агульны недахват рабочых рук, колькі цякучасьць, няўменьне выкарыстаць наяўныя кадры і недапушчальныя адносіны да мэханізмаў, г. зн. прычыны як раз суб'ектыўнага характару. На Гомельскім шклобудзе, Крычэўскім цэмэнтным заводзе, на пабудове Дому ўраду культурна-бытавыя ўмовы вельмі дрэнныя. Рабочых не забясьпечылі чыстымі і культурнымі інтэрнатамі, не наладзілі рабочага забясьпячэньня. Культурна-масавая работа на радзе пабудоў — пустое месца. Ня дзіўна, што пры такіх «клопатах» аб культурна-бытавых патрэбах рабочых з боку паасобных гаспадарчых, прафсыяльных і кааперацыйных арганізацый, цякучасьць на радзе пабудоў дасягае 85-90 проц. Прагулы таксама склалі пагражаючую лічбу. За 6 месяцаў па Белдзяржбудаб'яднаньні на 555.300 рабочых дзён прыпадае 100.000 нявыхадаў на работу, з якіх 53.000 па ніўважлівых прычынах.

Эксплёатацыя мэханізмаў пастаўлена дрэнна і вельмі часта дасягае ня больш 10-15 проц. Гэта-ж самае і з выкарыстаньнем унутраных працоўных рэсурсаў. Магчымасьці тут вялікія. Аб гэтым красамоўна сьведчаць вынікі разгортваньня сацспаборніцтва паміж каменшчыкамі, бэтоншчыкамі, што працуюць па цагельнай кладцы. Апошнія рэкорды, дасягнутыя менскімі рабочымі Дворкіным, Лацугіным, гомельскімі каменшчыкамі, паказваюць, якія посьпехі могуць быць разьвіты ў гэтым напрамку.

Уся справа ў тым, каб сваячасова падхапіць пачынаньні лепшых ударнікаў, здолець па-баявому мабілізаваць вакол гэтага пачынаньня шырокія масы будаўнікоў, дапамагчы ім пераняць вопыт перадавых і найбольш правільна расставіць сілы.

Некалькі слоў аб тым, як прэміюцца ўдарнікі. У мінулым годзе пры выкананьні па Белбудаб'яднаньні праграмы ў 23 млн. руб. на прэміяваньне ўдарнікаў выдаткавана ўсяго 18.000 руб. Былі факты, калі ў якасьці прэміі выдавалі... дзьве шклянкі. У той-жа час ляжаць бяз руху фонды для прэміяваньня ўдарнікаў на дзесяткі тысяч руб.

У будаўнічых арганізацыях гаспадарчы разрахунак ня стаў яшчэ штодзённым мэтадам кіраваньня вытворчасьцю і не арганізацыі зьверху да нізу. Далёка яшчэ ня зьвілічаны ў практыцы будаўніцтва ўраўнілаўка і абязьлічка.

Тав. Васэрман у заключэньне адзначыў, што плян капітальнага будаўніцтва па БССР у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі зусім рэальны. Гэта абавязвае ва што-б там ні стала дабівацца яго выкананьня. Перад усімі будаўнічымі канторамі, партыйнымі, прафсаюзнымі і кааперацыйнымі арганізацыямі на пабудовах стаіць баявая задача — у чатыры месяцы, якія засталіся да канца трэцяга рашаючага, ня толькі рэалізаваць заданьне партыі і ўраду у галіне капітальнага будаўніцтва, але нагнаць недавыкананае ў першым і другім кварталах.

М.

Мясапрадукты—рабочым цэнтрам

УСЕ ТЭРМІНЫ ДАЎНО ПРАЙШЛІ,

а плян загатовак жывёлы выканан толькі на 78 проц.

УДАРАМ ПА МЕСЬНІЦКІХ НАСТРОЯХ, ПА РАЗБЯЗАРВАНЬНІ МЯСНЫХ ПРАДУКТАЎ НА МЯСЦОХ ЛІКВІДУЕМ ПРАРЫВЫ У ЗАГАТОЎКАХ ЖЫВЁЛЫ

Поўнасьцю выканаць плян жывёлазагатовак

1-га верасьня скончыўся тэрмін скончэньня жывёлазагатовак, вызначаны ЦК і СНК БССР. Між тым плян загатовак па БССР выкананы толькі на 78%. Па радзе раёнаў процант загатовак яшчэ ніжэйшы. Так, Касьцюковіцкі раён даў 42% заданьня, Лепьчыцкі—49%, Быхаўскі — 53,6%, Чырвонапольскі — 53,6 проц., Бярэзінскі—54,9 проц., Вічебскі—55,8 проц., Веткаўскі—55,6 проц., Прапойскі—58,4 проц.

Гэтыя лічбы сьведчаць, што рад раённых арганізацый не разгарнуў баявых тэмпаў загатовак жывёлы, не мабілізавалі шырокія масы калгасьнікаў беднякоў і серадняковых вакол гэтай важнейшай кампаніі. Сацыялістычныя мэтады працы, сацспаборніцтва і ўдарніцтвы ня былі ўкараняны ў рабоце загатоўчых арганізацый. Апошнія спадзяваліся выключна на самацёк і на прымалі рашучых мер да выкананьня дыректыў партыі і ўраду па жывёлазагатоўках.

Той факт, што рад раёнаў ня толькі выканалі, але і перавыканалі свае заданьні (Чырвона-Слабодзкі — 182%, Ветрынскі—180,5%, Лагойскі — 164,8%, Капыльскі—160,8%, Бягомльскі—117,3%, Бешанковіцкі — 116%, Чашніцкі — 115,3%) сьведчыць што там, дзе раённыя арганізацыі аддалі належную ўвагу жывёлазагатоўчай кампаніі, мабілізавалі вакол яе працоўныя масы, там кампанія дала вялікія посьпехі.

Адсталыя раёны абавязаны неадкладна перабудаваць сваю работу, пераключыць яе на поўнае выкананьне плянаў загатовак жывёлы. Трэба ўзяць прыклад з перадавых раёнаў, якія з посьпехам скончылі работу. Апартуністычная недаацэнка жывёлазагатовак павінна сустрэць руйнуючы адпор з боку кіруючых раённых арганізацый.

Плян жывёлазагатовак можа і павінен быць выканан на ўсе 100%.

І. К.

Агідная безгаспадарчасьць

Белкаапсаюз не зварачае пінкай увагі на работу менскага сьвіна-матачнага пункту, дзе знаходзіцца 1.100 сьвіноматак. Даволі сказаць, што да гэтага часу пункт ня мае дыректара, у сувязі з чым на пункце панує поўная безгаспадарчасьць: сьвінарнікі ўсе паламаны, стрэхі цякуць, падлога брудная і заліта вадой. У выніку сярод сьвіней назіраюцца частыя выпадкі захворваньняў.

Безгаспадарчасьць на пункце прывяла да таго, што рабочыя пакідаюць працу і пераходзяць на іншую работу.

РАГАЎЦОВА.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

МАКСЫМУМ СІЛ—на сушку, уборку і вывазку торфу!

Асеньня-зімовыя перавозкі сустрэць на ўсеўзброенні

ПРАФРАБОТУ падпарадкаваць вытворчым задачам ТРАНСПАРТУ

Ударнік-чыгуначнік

Пленум Белбюро ЦК чыгуначнікаў пабальшавіку, з усёй рашучасьцю выявіў вялізарныя прарывы і недахопы ў рабоце прафесыянальных арганізацый чыгуначнікаў у справе падрыхтоўкі да асеньня - зімовых перавозак.

Члены пленуму — рабочыя ўдарнікі расказалі аб радзе фактаў апартуністычнай бязьдзейнасьці вучкрайпрафсачаў. Прафсаюзныя арганізацыі сваячасова не мабілізавалі чыгуначнікаў па выкананьне плянаў падрыхтоўкі да асеньня-зімовых перавозак. У выніку процант хворых паравозаў за апошні час значна павялічаецца. Так, напрыклад, па Жлобіне ў трэцяй дэкадзе ліпеня процант хворых паравозаў дасягнуў 18,79, а ў першай дэкадзе жніўня—19,49 проц. пры вызначанай норме ў 16 проц.; па Гомелі ў трэцяй дэкадзе ліпеня—18,7 проц., а ў першай дэкадзе жніўня—19,5 проц.; па Віцебску — адпаведна 22,6 проц.; 23,22 проц., па Воршы—16,1 і 17,8 проц.

Прафесыянальныя арганізацыі пабальшавіку не змагаліся за правядзеньне поўнай спаранай яды, а штампавалі весткі, якія давяліся адміністрацыяй. Адміністрацыя амаль усе выпадкі зрыву спаранай яды падводзіла пад графу «уважлівых прычын». Да заяў машыністаў па Воршы, Віцебску і г. д. аб тым, што спараная яда зрываецца, што ў месяц езьдзяць на 9 паравозах, часта мяняюцца качагары і памочнікі машыністаў, прафесыянальныя арганізацыі ня прыслухоўваліся.

На вытворчых нарадах аналіз работы дэпо ўвесь час не праводзіўся. Памочнік начальніка дэпо Ворша **Станкевіч** аналіз работы дэпо ня выносіць на вытворчыя нарады рабочых і інжынэрна-тэхнічных работнікаў толькі таму, што «няма ўказаньняў з цэнтру»... Тут ужо камэнтарыі непатрэбны.

Ударнікі Віцебска і Воршы т. т. **Бэрлін і Смыкаў** прыводзілі прыклады наўмыснага скарыстаньня рабочага дня, няправільнай расстаноўкі рабочай сілы ў дэпо і г. д. Вымяральнікі даюцца, выходзячы з 7-гадзіннага рабочага дня, а рабочы дзень у дэпо нагружан толькі на 5-5½ гадзін. Паравозы ставяцца ў рамонт не па графіку. Таксама паасобныя дэталі па плане не паступалі. Бясплянасьць стварае вялікія прастоі, або наадварот, перагрузку. «Кваліфікаваныя рабочыя 6 і 7 разраду, — гаворыць тав. **Лапкоўскі** (Менск),—носяць і чысьцяць дымгарныя трубы».

Тав. **Яснаўскі** (Асіпавічы) падае прыклады бесгаспадарчага выкарыстаньня паравозаў на Асіпавіцкім вузле. Паравозы з цягнікамі езьдзяць па 6 гадз., а на набор апалу і чыстку трацяць па 4-5 гадзін.

Перабудова прафработы з пункту погляду перацясьненьня цэнтру цяжару ў брыгаду, групу праведзена фармальна. Прафарганізатарамі ў штодзённай рабоце ніхто ня кіруе і яны ня ведаюць з чаго пачаць сваю работу.

Ударнік яшчэ ня стаў цэнтрам увагі прафэсыянальных арганізацый. У Гомелі брыгадзір лепшай ударнай брыгады па рамонце вагонаў тры месяцы хадзіў босы з тае прычыны, што «на яго пагу ў краме ня было абутку».

Гаспадарчы разрахунак праводзіцца марудными тэмпамі. На сёньняшні дзень толькі адзінкі паравозаў пераведзены на гаспадарчы разрахунак. Да гэтага часу **ні адна брыгада па рамонце вагонаў і паравозаў не праводзена на гаспадарчы разрахунак.**

Крытыка і самакрытыка яшчэ ня стала вострай баявой зброяй у штодзённай рабоце прафесыянальных арганізацый па выкрыцьці недахопаў, непаладак, канкрэтных прычын прарыву і г. д. Толькі гэтым можна вытлумачыць тое, што да апошняга часу мела месца «очковтирательство», не вялося барацьбы за выкананьне кожнага выяральніка і г. д.

Прафсаюзныя арганізацыі падышлі па-казённаму да прапрацоўкі прамовы тав. Сталіна — баявой праграмы дзеяньня. Ніхто раней не абгаварыў з групавымі прафарганізатарамі, як трэба ва ўмовах групы практычна ажыцьцяўляць указаньні тав. Сталіна. Уся работа зьвялася да таго, што «ў групах зачыталі прамову тав. Сталіна і гэтым абмежаваліся»... У Воршы была праведзена праверка выкананьня сацдагавору да рамонце паравозаў. Сярод брыгад, якія ня выканалі сацдагавору, ёсьць брыгада гарнітурная і кацельная. Гарнітурная брыгада выканала дагавор на 65 проц., а кацельная на 75 проц. Ня гледзячы на тое, што гэтыя вынікі вісяць больш 20 дзён, да гэтага часу вынікаў не абмяркавала ні гарнітурная, ні кацельная брыгады.

Пленум Белбюро ЦК чыгуначнікаў абавязаў усіх гаспадарнікаў і прафесыянальныя арганізацыі скарыстаць кампанію на праверцы выкананьня калдагавораў для сапраўднага ўзначаленьня вытворчага энтузіязму рабочых, дабіцца да 15 верасьня карэннага пералому ў выкананьні ўсіх вымяральнікаў як колькасных, так і якасных.

БЭРЗІНГ.

„ЧЫРВОНЫ ТАРФЯНІК" ПА-БАЯВОМУ СУШЫЦЬ, УБІРАЕ І ВЫВОЗІЦЬ ЗДАБЫТЫ ТОРФ

На 31 жніўня тарфяная прамысловасьць БССР здабыла 349.062,9 тон торфу, што складае 49,8 проц. гадавой праграмы.

За апошнюю дэкаду жніўня крывая торфаздабычы па 22 заводах Белторфу ўзрасла ўсяго на 1 проц.

Торфазаводы «Рэмізава», «Вольніца», «Чырвоная Беларусь», «Вялікі мох», «Калектыўная праца», «Чырвоны сьцяг» і «Смалявічы» ў апошнія дні на маюць амаль ніякага зруху ў тэмпах работы па здабычы торфу.

Значна адстаюць Асінторф, «Шлях сацыялізму» і іншыя заводы.

Скончылі сэзон торфаздабычы «Чырвоны тарфянік» і «Закрашынскі мох».

Ідуць наперадзе «Лекінскі шлях», «Новая Беларусь», «Бальшавік» і «Давыдаўка».

Па-ранейшаму слаба разгортваецца работа па сушцы, уборцы і асабліва па вывазцы здабытага торфу.

На гэтым адказнейшым вучастку работы патрэбны пералом пакуль што не наступіў.

Белторф яшчэ ня прыняў рашучых захадаў да фарсаванага разгортваньня сушкі, уборкі і вывазкі тарфянога апалу.

„Чырвоны тарфянік" высушыў і ўбраў 60 проц. здабытага торфу

З 22 заводаў Белторфу адзін толькі «Чырвоны тарфянік», які скончыў сэзонны плян торфаздабычы, разгарнуў баявую работу па сушцы, уборцы і вывазцы торфу.

Высушана і зложана ў штабелі 60 проц. тарфяных цаглін.

Заводам-спажыўцом торфу 28-га жніўня адгружана 92,2 тоны торфу, 29-га жніўня — 94,6 тоны.

Трыкутнік заводу праводзіць вялікую работу па кантрактацыі тарфянікаў і тарфяніц па будучы сэзон. Закантрактавана 185 рабочых.

Транспарт— „вузкае месца" Асінторфу

Замест 500 ваганэтак Белдрэс'у падаецца штодзенна ня больш 160-180

ПАТРЭБНА НЕАДКЛАДНАЯ ДАПАМОГА З БОКУ БЕЛТОРФУ І ВСНГ

Да 27 жніўня Асінторф прышоў з глыбокім прарывам. Здабыта толькі 64.676,8 тон торфу, што складае 53,3 проц. праграмы 1931 г.

Асабліва адстае Асінторф па здабычы фрэзэрнага торфу. Здабыта 10.310 тон, або 21,5 проц. заданьня.

ЦКК і НК-РСІ БССР вызначылі рад важнейшых мерапрыемстваў, ажыцьцяўленьне якіх дасьць магчымасьць Асінторфу дабіцца поўнай ліквідацыі прарыву.

Але гаспадарчае кіраўніцтва Асінторфу слаба мабілізуе рабочую масу на выкананьне гэтых паказаньняў, не перабудоўвае работы пачоваму.

Сацыялістычнае спаборніцтва разгортваецца слаба. З 24 брыгад толькі брыгады **Аўдошкіна Пятра, Грышчанкі, Аўдошкіна С.** і брыгада камсамольца **Падбірашка** пераўзыходзяць свае дзённыя заданьні. Астатнія брыгады далёка адстаюць.

Увядзеньне прэміяльна-прагрэсыўнай зьдзельчынны не замацоўваецца. Гаспадарчы разрахунак уведзен фармальна. Ніякіх станоўчых вынікаў ад гэтага пакуль што няма.

Самым вузкім месцам работы Асінторфу зьяўляецца транспарт.

Становішча чыгуначнага транспарту ні ў якім разе ня можа забясьпечыць сваячасовай вывазкі торфу, здабытага нават ў 1930 г.

Пастанова ЦК і СНК аб вывазцы Белдрэсу штодзённа ня менш 500 ваганэтак ня выконваецца. Белдрэсу падаецца штодзённа ня больш 160-180 ваганэтак.

Прычына гэтага — адсутнасьць патрэбнай колькасьці ваганэтак, ненармальная работа паравозаў і галоўнае—недахоп рэек для пракладкі новага 6-цікілямэтравага чыгуначнага шляху.

Каб дабіцца нармальнай работы транспарту, патрэбна бесадкладная дапамога з боку Белторфу і ВСНГ.

У пагражаючым становішчы знаходзіцца падрыхтоўка да будучага сэзону.

У 1932 г., паводле кантрольных лічбаў Белторфу, Асінторф павінен даць Белдрэсу 250 тыс. тон торфу, з якіх ня менш 40 проц. фрэзэрнага.

Асінторф не разгарнуў пакуль што ніякай работы па падрыхтоўцы да поўнага выкананьня праграмы будучага году.

Няма ніякіх паказаньняў па гэтым пытаньні і збоку Белторфу. Белторф недаацэньвае важнасьці Асінторфу, які зьлучаецца асноўнай апалазай базай прамысловасьці Віцебскага, Аршанскага і Магілеўскага раёнаў.

Трэба падрыхтаваць 800 гэкт. балота для фрэзэрнай здабычы. Для правядзеньня гэтай работы неабходна будзе затрацьць 60 тыс. рабочых дзён. Гэта значыць, што у верасьні павінна будзе працаваць 1.700 рабочых, у кастрычніку — 2.000 рабочых і ў лістападзе — 800 рабочых.

Асінторф пакуль што нічога не зрабіў, каб забясьпечыць завод патрэбнай рабочай сілай. Для разьмяшчэньня гэтай колькасьці рабочых не хапае бараказ, для пабудовы якіх няма лесематар'ялаў і грашовых сродкаў.

Прадугледжанае павялічэньне колькасьці машын па машына-фармоўчай здабычы торфу патрабуе падрыхтоўкі новых кар'ераў і капаньня магістральных каналаў. Гэта работа павінна быць скончана не позьней сьнежня 1931 г., але да яе Асінторф таксама не падрыхтаваўся.

Белторф і ВСНГ павінны прыняць рашучыя меры для бесадкладнага забясьпечэньня Асінторфу будматар'ялам і патрэбнымі сродкамі, бо будаўніцтва на Асінторфе адносена да ўдарных работ.

Неабходна прыняць усе захады да мэханізацыі работ як на падрыхтоўцы плошчы здабычы фрэзэрнага торфу, таксама і мэханізацыі капаньня магістральных каналаў.

Заводакіраўніцтва і прафсаюзная арганізацыя ў першую чаргу павінны зараз-жа разгарнуць шырокую масавую работу па замацаваньні ўсіх рабочых-тарфянікаў і тарфяніц пасьля скончэньня сэзону бягучага году для правядзеньня падрыхтоўчай работы да будучага сэзону.

Трэба разгарнуць работу па заключэньні дагавораў з калгасамі на плянавае забесьпячэньне рабочай сілай Асінторфу.

Заводакіраўніцтва і прафсаюзныя органы павінны ўжыць тэрміновыя захады да поўнай ліквідацыі абазьлічкі і ўраўнілаўкі, замацаваць прэміяльна-прагрэсыўную зьдзельшчыну, пераведзьці на гаспадарчы разрахунак работу ўсіх машын, усіх агрэгатаў.

Пасьпяховае правядзеньне падрыхтоўкі да будучага сэзону патрабуе поўнага выкананьня тых абяцаньняў і ўмоў, якія ўзялі на сябе прадстаўнікі шматлікіх арганізацый, прымаўшых удзел у арганізаванай 12-га жніўня «Комсамольскай Правдой» і «Чырвонай Зьменай» сустрэчы вытворцаў, спажыўцоў і пастаўшчыкоў абсталяваньня Асінторфу.

Горагляд.

ВЫКАНАНЬНЕ СЭЗОННАГА ПЛЯНУ ТОРФАЗДАБЫЧЫ (У ПРОЦ.)

26 ЖНІЎНЯ	27 ЖНІЎНЯ
48,8	49,0
28 ЖНІЎНЯ	**29 ЖНІЎНЯ**
49,2	49,5

30 ЖНІЎНЯ

49,8

ТОРФАЗАВОД „ЗАКРАШЫНСКІ МОХ" ВЫКАНАЎ СЭЗОННАЕ ЗАДАНЬНЕ

80 ПРОЦ. ТОРФУ ВЫСУШАНА, 60 ПРОЦ. УКЛАДЗЕНА Ў ШТАБЕЛІ

УСЕ СІЛЫ НА ВЫВАЗКУ!

РЭЧЫЦА. (ПА ТЭЛЕГРАФУ).

25-ГА ЖНІЎНЯ ТОРФАЗАВОД «ЗАКРАШЫНСКІ МОХ» СКОНЧЫЎ СЭЗОН ТОРФАЗДАБЫЧЫ.

ПРАГРАМА ЗДАБЫЧЫ ТОРФУ 1931 ГОДУ ВЫКАНАНА НА 93 ПРОЦ. ПА ВАЗЕ СЭЗОННАЯ ПРАГРАМА ВЫКАНАНА НА 106 ПРОЦ.

ГЭТЫЯ ПОСЬПЕХІ ДАСЯГНУТЫ ДЗЯКУЮЧЫ ТАМУ, ШТО КІРАЎНІЦТВА ТОРФАЗАВОДУ СВАЯЧАСОВА ПЕРАБУДАВАЛА СВАЮ РАБОТУ Ў АДПАВЕДНАСЬЦІ З НОВЫМІ ЗАДАЧАМІ І ПА - БАЯВОМУ МАБІЛІЗАВАЛА МАСЫ ТАРФЯНІКАЎ НА ЎДАРНУЮ ЛІКВІДАЦЫЮ ДАПУШЧАНАГА ПРАРЫВУ.

АСАБЛІВЫ ГЕРАІЗМ У БАРАЦЬБЕ ЗА ПРАГРАМУ ТОРФАЗДАБЫЧЫ ПАКАЗАЛА ЎДАРНАЯ БРЫГАДА ДЗЕРГАЧОВА, ЯКАЯ ПРЭМІЯВАНА СНК БССР.

БРЫГАДА ДЗЕРГАЧОВА БЫЛА ЗАСТРЭЛЬШЧЫКАМ ШЫРОКА - РАЗГОРНУТАГА ЎДАРНІЦТВА І САЦСПАБОРНІЦТВА НА ЗАВОДЗЕ.

ЗАРАЗ МАСА ТАРФЯНІКАЎ ПЕРАКІНУТА НА ФРОНТ СУШКІ І ЎБОРКІ ЗДАБЫТАГА ТОРФУ. ВЫСУШАНА 80 ПРОЦ. ЗДАБЫЧЫ, УКЛАДЗЕНА Ў ШТАБЕЛІ 60 ПРОЦ.

АДСТАЕ ВЫВАЗКА ТОРФУ. ТРЫКУТНІК ТОРФАЗАВОДУ ПАВІНЕН І НА ГЭТЫМ ВУЧАСТКУ РАБОТЫ ПАКАЗАЦЬ СВАЮ БАЯЗДОЛЬНАСЬЦЬ.

ЗАВОДЫ - СПАЖЫЎЦЫ ТОРФУ ПАВІННЫ ЗАРАЗ - ЖА КІНУЦЬ СВАЕ СІЛЫ НА ДАПАМОГУ ЗАВОДУ «ЗАКРАШЫНСКІ МОХ», ПА-БАЯВОМУ ПРАВЕСЬЦІ ЎБОРКУ І ВЫВАЗКУ ЗДАБЫТАГА ТАРФЯНОГА АПАЛУ.

НА ВОДНЫХ ШЛЯХОХ

Узяць курс на дысцыпліну!

ЦЬВЁРДАЕ АДЗІНАНАЧАЛЬЛЕ. ПРАГРЭСЫЎКУ І ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК—

НА КОЖНЫ ПАРАХОД

ПРАВЕРКУ КАЛДАГАВАРОЎ ПЕРАТВАРЫЦЬ У МАСАВУЮ ГАСПАДАРЧА-ПАЛІТЫЧНУЮ КАМПАНІЮ

Райкамвод БССР у верасьні праводзіць масавую праверку выкананьня калдагавораў і заключэньне дадатковых прававых і тарыфных згод.

Праверка будзе праведзена пад лозунгамі карэннага паляпшэньня сацыяльна-бытавога абслугоўваньня рабочых рэчнага транспарту і ў першую чаргу грузчыкаў, рашучага узмацненьня працдысцыпліны і г. д.

Між тым, трэба адзначыць, што справа з паляпшэньнем працоўнай дысцыпліны стаіць дрэнна.

Прафесыянальныя і гаспадарчыя арганізацыі рэчнага транспарту ўсюды слаба змагаюцца з канкрэтнымі парушальнікамі працоўнай дысцыпліны на прыстані, судне і г. д.

Напрыклад, параход «Ленін» яшчэ не пасьнее прычаліць да Лоеўскай прыстані, як уся каманда разьбягаецца па хатах.

Параход застаецца нават ня ўбраным. З нагрузкай апалу бывае вялікая заклыніка, адсюль ліпшія непрадукцыйныя прастоі параходу і г. д. Машыністу параходу «Леніна» і яго памочніку прыходзіцца самім ставіць лопасьці і абслугоўваць параход.

Або возьмем другі прыклад з таго-ж параходу «Ленін». 12-га жніўня гэты параход ішоў з Гомелю ў Кіеў. З прычыны таго, што камандзіру Даманаву захацелася пабачыць жонку, ён на пераканае «Радуль» робіць 1½ гадзінны непатрэбны прыпынак параходу. За жонкай Даманаў паслаў качагара Краўцова і апошні пагнаў параход толькі ў Кіеве.

Памочнікі камандзіраў параходаў «Правда» і «Ястраб» — Сухарукаў і Гаранскі ў Барысаве напіліся і пачалі дэбашырыць. Сухарукаў забраўся на калістанскі мосьцік параходу «Правда», пачаў даваць трывожныя гудкі. Пасьля гэтай хуліганскай выхадкі Сухарукаў пачаў выкідваць інвэнтар з параходу ў ваду і ламаць вокны.

Характэрна адзначыць, што камандзір параходу «Правда» замест рашучага змаганьня з п'яніцамі і лодырамі пакрывае агідны ўчынак свайго памочніка і нават бярэ яго пад сваю абарону.

Камандзір параходу «Юны ленінец» Шэрмэр і мэханік Жукаў сыстэматычна п'янствуюць у часе службовых абавязкаў.

Аднойчы параход «Юны ленінец» адчаліў ад Лоеўскай прыстані, але праз некаторы час прышлося параход затрымаць, бо мэханіка Жукава не аказалася па судне, а прычыны... напойкі. Апрача таго заўважана, што Шэрмэр перавозіць бясплатна пасажыраў.

Такіх прыкладаў грубога парушэньня працоўнай дысцыпліны і правіл унутранога распарадку можна прывесьці шмат.

Ня лепшая справа і з сацыяльна-бытавым абслугоўваньнем рабочых і ў першую чаргу грузчыкаў. Гаспадарнікі ва многіх месцах ня выконваюць пунктаў калдагавору, якія прадугледжваюць выдачу слэцвопраткі, ручнікоў, прадстаўленьне жыльлёвых і чакальных памяшканьняў, памяшканьняў над сталоўкі, клюбы і ленкуткі адлічэньняў у культфонд і г. д.

Да часу асеньняй навігацыі Днепрадзьвінскае кіраўніцтва павінна было пабудаваць для грузчыкаў і рабочых камандаў жыльлёвыя дамы ў **Гомелі, Барысаве, Віцебску Бабруйску** і г. д. Адзінак гэтае будаўніцтва да вызначанага тэрміну скончана ня будзе.

Прэзыдыум **райкамводу** ад 24 жніўня канстатаваў, што будаўніцтва жыльлёвых будынкаў і чакальнь ідзе надзвычай марудными тэмпамі, ня гледзячы на тое, што апошнія поўнасьцю забясьпечаны будматар'ялам.

Па Гомелі і па Бабруйску пляны будаўніцтва выкананы толькі на 15 проц.

У Магілеве пабудова чакальні яшчэ не распачата.

Толькі па адным **Віцебску** плян будаўніцтва выкананы на 95 проц.

Прэзыдыум райкамводу ўстанавіў апошнія жорсткія тэрміны скончэньня будаўніцтва. Па **Гомелі** прапанавана будаўніцтва дзяўчынага дому скончыць да 1-га кастрычніка, а каменнага будынку— да 15 сьнежня 1931 году. Па **Віцебску** пабудова 3-хпавярховага будынку павінна быць скончана да 10-та сьнежня, па **Бабруйску**—да 1-га сьнежня.

Пабудовы чакалень павінны быць скончаны да 1-га кастрычніка гэтага году.

Гэта дырэктыва райкамводу павінна быць ва што-б там ні стала рэалізавана ў тэрмін.

З грамадзкім гарчаваньнем справа ня лепшая. Да гэтага часу для грузчыкаў не наладжана кругласутачная падача гарачай стравы.

Абеды надзвычай дрэннай якасьці. У сталоўках пануе бруд, бакі з гатаванай вадой адсутнічаюць.

Капэрацыя рэчнага транспарту яшчэ не павярнулася тварам да сапраўднага лепшага абслугоўваньня грузчыкаў і рабочых камандаў параходаў.

На картцы ўдарнікаў ударнікам амаль нічога не выдаюць.

Праверка выкананьня дагавораў і заключэньне дадатковых тарыфных згод павінна бязумоўна быць цесна ўвязана з грамадзка-вытворчым аглядам падрыхтованасьці рэчнага транспарту да асеньняй навігацыі.

Калдагаворную кампанію трэба ператварыць у масавую гаспадарча-палітычную кампанію за пасьпяховае выкананьне трансфінпляну і паляпшэньне сацыяльна-бытавых умоў рабочых.

У часе масавай праверкі павінны быць выяўлены на кожным судне, прыстані і судна-рамонтных майстэрнях гультаі лодыры, п'яніцы, якія зрываюць пасьпяховую работу рэчнага транспарту.

Трэба таксама выявіць усіх тых гаспадарнікаў, якія нядбайна, наплявацельскі адносяцца да законных запатрабаваньняў рабочых у пытаньнях аховы працы па выдачы слэцвопраткі, увядзеньня прагрэсыўнай зьдзельчыны, пераводу на гаспадарчы разрахунак і г. д.

Калдагаворная кампанія побач з дрэннымі момантамі павінна паказаць усёй пралетарскай грамадзкасьці лепшых рабочых-ударнікаў і гаспадарнікаў, якія на аснове калдагавору паказалі ўзорныя прыклады барацьбы за трансфінплян.

КЛІЕНТУРА ТАРМОЗІЦЬ ПЕРАВОЗКІ

НЕАДКЛАДНА ЗАКЛЮЧЫЦЬ ДАГАВАРЫ І ДАЦЬ ЗАЯЎКІ

СНК БССР у сваёй пастанове ад 3-га жніўня 1931 году па дакладу нач. Днепрадзьвінскага кіраўніцтва аб падрыхтованасьці рэчнага транспарту да асеньняй навігацыі абавязаў Белкаапсаюз, Белплодагароднину, Белсамтрамсаюз, Лесбел і інш. гаспадарчыя арганізацыі ў ДЗКАДНЫ ТЭРМІН ПЕРАГЛЕДЗЕЦЬ І УДАСКАНАЛІЦЬ ЗАЯЎКІ ГРУЗАПЕРАВОЗАК ПА ВОДНЫХ ШЛЯХОХ.

З моманту пастановы СНК БССР ужо прайшло 3 дэкады. Задавалася-б, што за гэты пэрыяд дагаворная кампанія будзе скончана, плянаванае перавозак будзе мець выразны малюнак і Днепрадзьвінскае кіраўніцтва зможа працаваць па-новаму.

Але на справе гэта далёка ня так. Гаспадарчыя арганізацыі і ў першую чаргу БЕЛКААПСАЮЗ, ЯГО ГАЛІННЫЯ АБ'ЯДНАНЬНІ БЕЛПЛОДАГАРОДНІНА і яе сыстэмэ, мабыць, «забыліся» аб пастанове СНК БССР. Заключэньне дагавораў ідзе надзвычай марудными тэмпамі.

КЛІЕНТУРА БАІЦЦА ЗАКЛЮЧАЦЬ ДАГАВАРЫ І ШУКАЕ РОЗНЫХ ЛАЗЕЕК ДЛЯ ТАГО, КАБ ЗАЦЯГНУЦЬ ДАГАВОРНУЮ КАМПАНІЮ, застрахаваць сябе ад непрад'яўленьня грузаў і г. д.

Толькі гэтым можна тлумачыць, што на сёньняшні дзень, з моманту пастановы СНК БССР, дагавары заключаны толькі на перавозку 65 тон грузаў.

Рэчнаму транспарту на час асеньняй навігацыі патрэбна ня менш, як 400.000 тон грузаў, а на 25-га жніўня г. г. Днепрадзьвінскае кіраўніцтва мае заключаных дагавораў на перавозку грузаў на 265 тыс. тон, прычым з іх 200 тыс. тон застаўся яшчэ ад весняной дагаворнай кампаніі.

Апрача гэтага ёсьць яшчэ не аформленыя заяўкі на перавозку 30 тыс. тон гародніны па рэчным транспарце.

СЛАБЫ ХОД ДАГАВОРНАЙ КАМПАНІІ ПА ПЕРАВОЗКАХ ГРУЗАЎ—ПРОСТАЯ ПАГРОЗА ЗРЫВУ ТРАНСФІНПЛЯНУ АСЕНЬНЯЙ НАВІГАЦЫІ 3-га РАШАЮЧАГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ.

Адсутнасьць плянавых заявак на ўвесь пэрыяд асеньняй навігацыі не дае магчымасьці рэчнаму транспарту правільна расставіць свае сілы, разьмеркаваць флёт, грузчыкаў і г. д.

Па наспраўднай клієнтуры, якая ўпарта ігнаруе дырэктывы партыі і ўраду аб заключэньні дагавораў, трэба моцна ўдарыць.

Кіраўнікоў гаспадарчых аб'яднаньняў БЕЛПЛОДАГАРОДНІНЫ, БЕЛКААПСАЮЗУ, ЛЕСБЕЛУ і інш. арганізацый, якія ня выканалі апошняй пастановы СНК БССР ад 3-га жніўня, пракуратура рэспублікі павінна прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці.

Мы яшчэ раз сьцьвярджаем, што грузы ёсьць, але ёсьць і такая клієнтура, якая не жадае прад'яўляць гэтыя грузы ў плянавым парадку на аснове дагавору, а імкнецца прасоўваць іх у няплянавым парадку, калі ёй гэта хочацца.

Адначасова неабходна адзначыць, што з боку Днепрадзьвінскага кіраўніцтва і многіх станцый і на сёньняшні дзень існуе хападок у пытаньні пасьпяховага скончэньня дагаворнай кампаніі.

ДНЕПРАДЗЬВІНСКАЕ КІРАЎНІЦТВА І ПРЫСТАНІ ня прымаюць належных захадаў для ўсямернага прыцягненьня грузаў на ваду.

Да гэтага часу няма ўзаемнай дагаворанасьці паасобных прыстаняй з сумежнымі чыгуначнымі станцыямі аб перакідцы паўных відаў грузаў на ваду, якія могуць быць з посьпехам перавезены рэчным транспартам.

Рабочыя і служачыя рэчнага транспарту павінны добра памятаць, што за зрыў трансфінпляну ў першую чаргу яны самі будуць несьці адказнасьць перад дзяржавай і пралетарскай грамадзкасьцю. Таму рабочыя воднікі і ўся пралетарская грамадзкасьць рэчнага транспарту павінна быць мабілізавана для прыцягненьня грузаў, павінна прымусіць эпосную клієнтуру тэрмінова заключыць дагавары і г. д.

Кожнай прыстані неабходна зараз-жа дагаварыцца з адміністрацыяй сумежных чыгуначных станцый на прадмет перакідкі паўных відаў грузаў з чыгункі на рэчны транспарт.

Арганізаваныя брыгады воднікаў па выяўленьні грузаў, якія могуць быць перавезены рэчным транспартам, павінны аб кожным канкрэтным выпадку нежаданьня таго ці інш. гаспадарніка заключыць дагавор, тэрмінова сыгналізаваць органам пракурорскага нагляду, РСІ і г. д.

Закон барацьбы за прыцягненьне грузаў на воды павінна быць мабілізавана ўся пралетарская грамадзкасьць як рэчнага транспарту, так і клієнтуры.

Забясьпечыць поўнасьцю танаж суднаў, арганізаваць плянавую дастаўку грузаў на воды, выкарыстаць поўнасьцю ў часе асеньняй навігацыі тэхнічныя магчымасьці рэчнага транспарту — баявая задача транспартных, плянуючых і гаспадарчых арганізацый.

АПАЛ—ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ І РАБОЧЫМ ЦЭНТРАМ

НЕ МАРУДЗІЦЬ з дастаўкай дроў

Жнівеньскі плян па забясьпячэньні Менску дровамі выкананы усяго на 12,4 проц. Адгружана, замест прадугледжаных плянам 3.100 вагонаў, толькі... 384.

А між тым па станцыях Бярэзіна, Старушкі і на чыгуначных ветках Капцэвічы—Мулярэўка, Рудабельская, Хойнікі — Аўраамаўская, Васілевічы — Дэміховіцкая, Асіповічы — Войніцкая і Верадцоўская падрыхтавана для адгрузкі Менску звыш 2.000 вагонаў дроў.

Адгружа зрываецца выключна з-за адсутнасьці вагонаў-паражняку.

Толькі адзін Жлобінскі вузел можа падаваць штодзённа 10-20 вагонаў, што зьяўляецца зусім невыстарчальным для таго, каб наладзіць бесьперабойную дастаўку дроў працоўным Менску.

Апрача гэтага чыгунка мае магчымасьць раз у тыдзень падаваць пад адгрузку дроў баляны цягнік з 30 вагонаў, пры ўмове, калі Лесбел забясьпечыць сваячасовую разгрузку вагонаў.

Вось чаму Лесбел і ў прыватнасьці нізавыя загатоўчыя арганізацыі павінны наладзіць выразную работу свайго апарату, дабіцца сваячасовай нагрузкі і адпраўкі тых вагонаў, якія чыгунка зможа прадставіць для вывазкі дроў.

Чыгунка мае пязначную колькасьць вагонаў і пляцформ, якія могуць быць выкарыстаны для перавозак дроў толькі пасьля правядзеньня некаторага рамонту.

Гэта ставіць баявую задачу перад працоўнымі Менску і ў прыватнасьці перад чыгуначнікамі па арганізацыі неадкладнага рамонту вагонаў, што дасьць магчымасьць узмацніць работу па забясьпячэньні Менску апалам.

На лесасплаве

АСІПАВІЦКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ ня кіруюць дровазагатоўкамі

Заможнікі ня выконваюць цьвёрдых заданьняў

АСІПАВІЧЫ (па тэлеграфу).

Асіпавіцкі Леспрамгас усё яшчэ не дабіўся зруху ў кампаніі дровазагатовак.

Вывазка загатоўленых дроў да пунктаў адпраўленьня зрываецца.

Дагавары на загатоўку і вывазку дроў з пераважнай большасьцю калгасаў раёну не заключаны.

Заможная частка насельніцтва сыстэматычна ня выконвае цьвёрдых заданьняў як па вывазцы дроў, так і па загатоўках.

Апарат вучлесгасаў і сельсаветы бязьдзейнічаюць. Раённыя арганізацыі ня прымаюць рашучых захадаў да поўнага выкананьня вызначаных плянаў дровазагатовак і вывазкі, ня прыцягваюць да адказнасьці сельсаветы, якія зрываюць гэту работу.

Раённая пракуратура павінна наладзіць паказальныя суды над злоснымі зрыўшчыкамі цьвёрдых заданьняў.

ТАРАСЕВІЧ, ЛЕВІН, ЛАНІЦКІ.

Дровы чакаюць адпраўкі

ПАСТАЛЫ (па тэлеграфу).

На станцыі Старушкі МБЖ чыгункі ляжыць 200 вагонаў дроў, якія загатовіў Пастылаўскі леспрамгас для адпраўкі ў Менск.

Адгрузка дроў у Менск зрываецца па віне чыгункі, якая не падае вагонаў.

На 3-ю дэкаду жніўня Леспрамгас даў заяўку на 40 вагонаў, Чыгунка не дала ніводнага.

Брыгадзір Менгарсавету ЗАВЕЛЕВІЧ.

ПАМЯЦІ А. В. КАНЧЭЎСКАГА



31 жніўня 1931 г. трагічна загінуў на Каўказе ў часе пячэньня адзін з самых адданых барацьбітоў за пралетарскую справу, верны сын працоўных падняволенай Зах. Беларусі, член ЦК КПЗБ — тав. Арсень КАНЧЭЎСКІ (Владэк Камінскі).

Владэк нарадзіўся ў 1901 г. на Зах. Беларусі ў Вільні. Ужо ў раньняй маладосьці ён далучаецца да нацыянальна-вызваленчага руху на Зах. Беларусі. У 1922 г. ён уступае ў рады падпольнай беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі і хутка становіцца адным з віднейшых яе кіраўнікоў і разам з другімі таварышамі падрыхтоўвае аб'яднаньне БРА з кампартыяй ЗБ. З 1924 г. Владэк зьяўляецца членам ЦК КПЗБ і кіруе работай на вёсцы ва ўмовах Зах. Беларусі асабліва важнай.

Яму не ўдалося, аднак, разгарнуць на гэтай рабоце ўсіх сваіх сіл і здольнасьцяй. Ужо ў маі 1924 г. Владэка два разы арыштоўваюць і пасьля двухгадовага папярэдняга прабываньня ў турме ён асуджаецца да чатырох год катаргі. На працягу ўсяго амаль пяцігадовага прабываньня ў польскіх турмах Владэк зьяўляецца прыкладам гераічнай стойкасьці, самаахвярнай адданасьці рэвалюцыі і бальшавіцкай дысцыпліванасьці. Ва ўмовах турмы ён ўсё-ж вядзе рэвалюцыйную дзейнасьць, змагаецца за чыстату партыйнай лініі і ўсямерна дапамагае ліквідаваць групу «сэцэсіі», якая ўзьнікла ў той час. За ўвесь час свайго прабываньня ў турме Владэк нязьменна кіруе побач з іншымі таварышамі барацьбой палітзьняволеных у Лукіскай, Вронкаўскай і Равіцкай турмах за паляпшэньне турэмнага рэжыму.

Пасьля вызваленьня з турмы ў 1928 годзе Владэк па даручэньні партыі, зьяўляецца адным з кіраўнікоў рэвалюцыйнага руху на Зах. Беларусі. Прасьледваўся паліцыяй і з дазволу партыі выяжджае ў СССР, дзе падрыхтоўваецца да далейшай рэвалюцыйнай дзейнасьці.

Сьмерць вырвала тав. Владэка з радоў змагароў у момант асаблівага напружаньня клясавых баёў у Польшчы і Зах. Беларусі.

Памяць аб тав. Владэку—нястомным барацьбіту і адданым таварышу—будзе жыць у памяці рэвалюцыйнага пралетарыяту і сялянства, якія давядуць да пераможнага канца тую справу, за якую Владэк аддаў лепшыя гады свайго жыцьця.

Чэсьць памяці тав. Владэка.

ПОЛЬСКАЯ СЭКЦЫЯ КАМІНТЭРНУ.

ЦК КПЗБ АД ЦК КП(б)Б

ЦК КП(б)Б ВЫКАЗВАЕ СВОЙ ГЛЫБОКІ ЖАЛЬ І СПАЧУВАНЬНЕ КПЗБ І ЯЕ ЦЭНТРАЛЬНАМУ КАМІТЭТУ З ПРЫЧЫНЫ ПРАДЧАСНАЙ ТРАГІЧНАЙ СЬМЕРЦІ ТАВ. А. В. КАНЧЭЎСКАГА, ЧЛЕНА ЦК КПЗБ.

СЬМЕРЦЬ ТАВ. ВЛАДЭКА — ЦЯЖКАЯ СТРАТА ДЛЯ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ І ДЛЯ ЎСЯГО РЭВАЛЮЦЫЙНАГА РУХУ ЗБ І ПОЛЬШЧЫ. ЯШЧЭ БОЛЬШ ЦЯЖКАЯ ГЭТА СТРАТА ЗАРАЗ, КАЛІ КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ ВЯДЗЕ РАБОЧЫХ І СЯЛЯН ДА РАШУЧЫХ БАЁЎ СУПРОЦЬ ДЫКТАТУРЫ ФАШЫЗМУ, ЗА ПРАЛЕТАРСКУЮ РЭВАЛЮЦЫЮ.

БРАЦКАЯ КПЗБ ЦЬВЕРДА ПОЙДЗЕ, ПАД КІРАЎНІЦТВАМ СВАЙГО ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ, ДА НОВЫХ КЛЯСАВЫХ БОЕК, УЗНАЧАЛЬВАЮЧЫ МАСЫ ПРАЛЕТАРЫЯТУ І СЯЛЯНСТВА, ЯКІЯ ЗМАГАЮЦЦА ЗА СВАЕ ВЫЗВАЛЕНЬНЕ З-ПАД ЯРМА ФАШЫЗМУ.

НА МЕСЦА ТАВ. ВЛАДЭКА СТАНУЦЬ НОВЫЯ КАЛЕНЫ БАРАЦЬБІТОЎ ЗА СПРАВУ КАМУНІЗМУ.

МАЦНЕЙ РАДЫ, ТАВАРЫШЫ!

НЯХАЙ ЖЫВЕ КАМУНІСТЫЧНЫ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ!

НЯХАЙ ЖЫВЕ БРАЦКАЯ КПЗБ І ЯЕ ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ!

ЦК КП(б)Б.

Менскі гарадзкі камітэт КП(б)Б разам са ўсёй гарадзкой партарганізацыяй выказвае свой глыбокі жаль і спачуваньне КПЗБ і яе Цэнтральнаму Камітэту з прычыны прадчаснай трагічнай сьмерці члена ЦК КПЗБ тав. Арсеня Ўладзімеравіча Канчэўскага, якая пасьледвала 31 жніўня ў Геленджыку.

Менскі гарком КП(б)Б заклікае членаў партыі і камсамолу, а таксама рабочых прыняць удзел у пахаваньні тав. Канчэўскага.

Для арганізацыі пахаваньня тав. А. В. Канчэўскага створана камісія ў складзе т. т. Гурэвіча (ЦК КП(б)Б), Кавальчука (Менгарком КП(б)Б) і Варонічава (ЦК МОПР'у БССР).

АД КАМІСІІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ ПАХАВАНЬНЯ ТАВ. КАНЧЭЎСКАГА А. В.

Пахаваньне адбудзецца 5 верасьня. Вынас цела з Дому Камасьветы на брацкія могілкі ў 17 гадзін. Доступ да цела для ўсіх адкрыт 5-га верасьня з 12 да 16½ гадзін у Доме Камасьветы.

Камісія па арганізацыі пахаваньня тав. Канчэўскага заклікае замест вянкоў на магілу ўносіць сродкі ў фонд дапамогі палітзьняволеным ЗБ і Польшчы.

Усебеларуская культпропнарада па пытаньнях транспарту

Учора скончыла сваю работу склікана Культпропам ЦК КП(б)Б усебеларуская культпропнарада, прысьвечаная пытаньням чыгуначнага і воднага транспарту. Нарада заслухала даклады: тав. Чарнушэвіча — аб рэканструкцыі транспарту і аб задачах культпрапработы; тав. Брытневіча (НКАсьветы) — аб становішчы і задачах культурнага будаўніцтва на транспарце.

У спрэчках па першым пытаньні (2 верасьня) выказаліся т. т. Сабалеўскі і Кудзелька (Жлобін), Лукаш і Дынэрштэйн (Гомель), Круклікаў і Клімаў (Культпроп ЦК), Шулаеў, Абаў (Гомграфсаюз), Этле (упаўнаважаны НКШЗ), Янкін (ЦК КП(б)Б). Першы дзень нарады скончыўся заключным словам тав. Чарнушэвіча.

На дакладу тав. Брытневіча (другі дзень нарады) у спрэчках выказаліся наступныя т. т.: Ліокумовіч (Віцебск), Крук (Менск), Палічанскі («Рабселькор»), Галушкоў, Групакоў, Салдаценка (сэкцтар друку ЦК), Азерскі, Барабан, Лакашук (Гомель), Нілацюк (Ворша) і інш.

Нарадай прыняты пастановы, у якіх намечаны асноўныя задачы, што стаяць перад партарганізацыямі чыгуначчна-воднага транспарту, нізавым друкам і рабкоўскім рухам у галіне партасьветы і культурнага будаўніцтва, аб чым будуць надрукаваны матар'ялы ў бліжэйшых нумарох газэты.

Мінск. друкарня «Зьвязды»

Пралетары Францыі, Нямеччыны, Англіі!

На абарону палоньнікаў ПОЛЬСКАГА ФАШЫЗМУ

Адозва пралетараў Бабруйску

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Багацьці, створаныя вашым потам і крывёю, волаты прамысловасьці, вялізарнейшыя запасы прадметаў спажываньня, — усё гэта капіталізм наніраваў супроць вас. На фабрыках і заводах, абсталяваных па апошнім слове тэхніці, няма працы для вас, капіталізм выкідае вас на вуліцу, робіць беспрацоўнымі. У той час, калі вы і вашы дзеці галадуюць, капіталісты палаць пшаніцай паравозы, выкідаюць прадукты харчаваньня ў мора, абы не панізіць свае прыбыткі. Капіталізм задыхаецца ў ціскох крызісу, ён асудзіў да галоднай сьмерці дзесяткі тысяч рабочых і працоўных.

Фашысцкая Польшча зьяўляецца адным з найслабейшых зьвяньняў усёй капіталістычнай сыстэмы і таму жудасьць капіталістычнай сыстэмы ў дзесяткі і сотні раз больш адчуваюць рабочыя і працоўныя Польшчы.

Магутны ўзрост сацыялізму ў СССР —бацькаўшчыне сусьветнага пралетарыяту, — штодзённае паляпшэньне становішча працоўных Савецкага Саюзу, поўнае зьнішчэньне беспрацоўя, 7-гадзінны рабочы дзень і 5-цідзённы рабочы тыдзень — вось вынікі сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР.

Гэтыя вынікі ня могуць не выклікаць вялізарнейшай сымпатыі з боку рабочых і працоўных усяго сьвету да краіны будаўніцтва сацыялізму — СССР. Гераічныя прыклады пралетарыяту Савецкага Саюзу натхняюць пралетарыят усяго сьвету на барацьбу супроць загніваючага капіталізму.

Пралетарыят і працоўныя масы фашысцкай Польшчы, працоўныя Зах. Беларусі і Зах. Украіны, якія адчуваюць на сабе ўсе жахі капіталістычнай сыстэмы, увесь цяжар вялікадзяржаўнай палітыкі польскага фашызму, падымаюцца на барацьбу супроць польскага фашызму, за Савецкую Польшчу.

Польскі фашызм ідзе ў авангардзе капіталістычных дзяржаў у справе падрыхтоўкі ўзброенага нападу на СССР. Менна на польскі фашызм сусьветным імпэрыялізмам усклядаецца авангардная роля ва ўзброеным нападзе на СССР.

Таму взьвярэлыя фашысты з такой ярасьцю і бесчалавечнасьцю распраўляюцца з лепшымі прадстаўнікамі польскага пралетарыяту і перадавымі змагарамі за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленьне Зах. Беларусі і Зах. Украіны.

Кроў стыне ў жылах ад тых зьдзекаў, якія твораць польскія фашысты над 10-тысячнай арміяй змагароў супроць нячуванага ўціску. Міззрнымі выдаюцца спрэдняявяковыя катаваньні ў параўнаньні з тымі зьдзекамі, якія польскі фашызм ужывае да сваіх палоньнікаў.

Зараз мы зьяўляемся сьведкамі новага нячуванага ў гісторыі чалавецтва зьверства. Польскі палітзьняволены страціў свае апошнія нязначныя правы. Ён цалкам і поўнасьцю перададзены на расправу групе бандытаў, што завуцца польскімі турэмнымі наглядчыкамі. Новы турэмны рэжым прывёў лепшых прадстаўнікоў рабочай клясе да адзінага спосабу палітзьняволенага выказаць свой пратэст—да галадоўкі. Азьвярэлая пілсудчына хоча дасягнуць сваёй мэты — ачысткі пляцдарму для вайны супроць СССР — шляхам фізычнага зьнішчэньня перадавых барацьбітоў рабочае клясы і працоўнага сялянства.

Мы, пралетары і ўсе працоўныя Бабруйшчыны, яшчэ добра памятаем гаспадараньне польскага фашызму на нашай тэрыторыі.

ПАДЫМАЮЧЫ СВОЙ ГОЛАС ПРАТЭСТУ СУПРОЦЬ ГЭТЫХ ЗЬДЗЕКАЎ, МЫ ЗВАРАЧАЕМСЯ ДА ВАС, ПРАЛЕТАРЫ НЯМЕЧЧЫНЫ, АНГЛІІ, ФРАНЦЫІ, КАБ І ВЫ ПАДНЯЛІ СВОЙ ГОЛАС ПРАТЭСТУ СУПРОЦЬ НЯЧУВАНЫХ У ГІСТОРЫІ ЗЬДЗЕКАЎ НАД ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫМІ, СУПРОЦЬ ФІЗЫЧНАГА ЗНІШЧЭНЬНЯ ЛЕПШЫХ ПРАДСТАЎНІКОЎ РАБОЧАЙ КЛЯСЫ І ПРАЦОЎНЫХ ПОЛЬШЧЫ, ЗАХ. БЕЛАРУСІ І ЗАХ. УКРАІНЫ. Затрымайце руку ката, якая занесена над рэвалюцыйнымі рабочымі Польшчы, працоўнымі Зах. Беларусі і Украіны. Акажэце ім усямерную дапамогу.

Няхай жыве і мацнее сусьветная салідарнасьць працоўных!

Прач фашысцкіх катаў і іх дапаможнікаў — польскі сацыял-фашызм!

Няхай жыве сусьветная рэвалюцыя!

Масавае ўцяканьне беспрацоўных з Фінляндыі ў СССР

ФІНЛЯНДЗКАЯ БУРЖУАЗІЯ УСТРЫВОЖАНА

ГЕЛЬСІНГФОРС. Фінляндзкі друк устрывожан частымі выпадкамі масавага пераходу граніцы беспрацоўнымі, якія ўцякаюць у СССР у пошуках работы. Гэтымі днямі фінская пагранічная ахрана затрымала ў фінскай затоцы групу з 40 чал., якія прабавалі на лодках пераехаць у СССР. Арыштаваныя перададзены ахранцы. У сувязі з гэтымі арыштамі фашысцкая «Аян Сана» абвінавачвае савецкую ўладу ў незаконнай вярбоўцы і ў незаконнай перакідцы ў СССР нехапаючых там кваліфікаваных рабочых. Сьмехатворнасьць гэтага цьверджаньня выкрываецца сёньня органам аграраў «Суомен Маа», які на падставе паведамленьняў, атрыманых ад ахранкі, піша, што сярод арыштаваных няма ні аднаго камуніста, а таксама, што яны сапраўды шукалі спосабу перабрацца ў СССР з упэўненасьцю, што там яны знойдуць заработак. Апрача таго, газэта паведамляе, што на працягу гэтага лета з Фінляндыі ўцякло ў СССР у пошуках работы некалькі соцень чалавек. (ТАСС).

Сацыял-фашысты на чале аграблень ня беспрацоўных

БЭРЛІН, 31. Праект аб замене грашовых дапамог, якія распрацоўваецца нямецкімі ўрадавымі органамі, аб чым гаварыў у сваім выступленьні на зьезьдзе рэфармісцкіх прафбюракратаў кямецкі міністар працы Штэгервальд, ня толькі сустракае падтрыманьне з боку нямецкай буржуазіі, але і пачынае ўжо ператварацца ў жыцьцё. Да чаго імкнецца буржуазія пры дапамозе гэтага праекту аграбленьня беспрацоўных, відаць з заявы газэты «Дэйчэ Тагес Цайтунг», якая піша, што будзе зусім даволі, калі беспрацоўныя атрымаюць штодзённа пітар супу і фунт хлеба. У некаторых акругах Ніжняй Сілезіі ўжо пачалі часткова ажыцьцяўляць гэты праект. У гэтых акругах беспрацоўным, якія атрымліваюць дапамогу з муніцыпальных дабрачынных кас, 30 проц. дапамогі выдаецца натурай — хлебам, мукой і крупамі. Прадукты, якія выдаюцца беспрацоўным, дастаўляюць сяляне і гандляры ў кошт падаткаў, што належаць з іх.

Польскія мэталісты даюць адпор капіталістам

ВАРШАВА. У апошнія часы фашысцкі ўрад праводзіць вялізарныя звальненьні чыгуначнікаў. На чыгунках у аднэй толькі Верхняй Сілезіі мае быць звольнена звыш 2.000 рабочых і спужачых.

Адначасова з гэтым як урад, так і ўсе саюзы капіталістаў праводзяць жорсткае наступленьне на эканамічнае становішча рабочых, усюды зьніжаючы зарплату. У сувязі з гэтым распачаўся моцны ўздым забастоўчнай хвалі.

Як паведамляе фашысцкі друк, 24 жніўня раніцою ўсе рабочыя жалезналіцейнага заводу «Покуй» у Новым Бытове правялі паўгадзінную забастоўку супроць зьніжэньня зарплаты, якое абвясьціла арбітражная камісія. Такая самая забастоўка адбылася ў жалезналіцейным заводзе «Парушовец» пад Рыбнікам.

Год выданьня—XV
№ 240 (4145)
Пятніца 4 верасьня 1931
Цана нумара 5 кап.
выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК Мен. Гарксму Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА: Менск, Савецкая 60. Тэлефоны: рэдактар—2-77, сакрэтар—10-74, кантора—2-77, гранмыс.—13-50, сек. вёскі—6-19, мясц. інформ.—8-19, сек. інформ.—6-19, сек. рабфакаў—6-42, сек. рабкораў—10-74, сек. жанчын—10-74, сек. фізкультуры—7-61.

На дапамогу палітзьняволеным фашысцкай Польшчы

Пілсудзкі дэкрэтуе скасаваньне ўстаноўленага трэмнага рэжыму для палітзьняволеных.

Гэты дэкрэт павінен уступіць у моц з 1-га кастрычніка, аднак, 7-га жніўня 150 палітзьняволеных Горадзенскай турмы ўжо кінуты ў карцэры, дзе 9 дзён праводзілася арганізаванай галадоўка.

Агенцтва «Зюд-Эст» падае наступнае паведамленьне:

«Варшава, 21/VIII. Міністэрства ўнутраных спраў апублікавала дэкрэт аб скасаваньні ўсіх прывілей, якімі карысталіся датэтуль у польскіх турмах палітзьняволеныя. Паводле зьместу дэкрэту ўсе палітзьняволеныя будуць пераведзены на агульны турэмны рэжым».

У чым заключаецца гэты «агульны турэмны рэжым»? Зьняволеныя, прызнаныя «небясьпечнымі», змогуць быць поўнасьцю ізаляваны, як гэта практыкуецца ў катаржных турмах у Мусаліні (на працяту 2-х тыдняў).

Аднак, гэты тэрмін можа быць прадоўжан па волі турэмнай адміністрацыі. Асуджаныя, якія будуць пратэставаць супроць катаваньняў, будуць пакінуты ў поўнай ізаляцыі на неакрэсьлены тэрмін.

У сапраўднасьці, калі гаворыць «абураўненьні» ў турэмных правох палітзьняволеных з крымінальнымі, дык толькі набліжаюцца да праўды, бо рэжым, які ўводзіцца новым дэкрэтам для нашых таварышоў, на многа цяжэй рэжыму, які прыстасоўваецца да крымінальнікаў. Гэта «ўраўненьне ў правох» з крымінальнікамі па сутнасьці прадстаўляе поўную магчымасьць для бандытаў з фашысцкай охранкі забіваць патаемна і яўна польскіх рэвалюцыянэраў.

Гэта нішто іншае, як легалізацыя сыстэмы катаваньняў і скасаваньне тых нязначных абмежаваньняў, якія датэтуль стрымлівалі запал катаў.

Цікавая дэталь, якая сьведчыць аб глыбокім крызісе, што перажывае фашысцкая дыктатура Польшчы: дэкрэт увойдзе ў моц толькі з 1-га кастрычніка. Навошта гэта адтэрмінаваньне? Урад баіцца зьняволеных, дзіх ён трымае ў турмах. Ён ведае, што безадкладнае ўвядзеньне ў моц гэтага дэкрэту выклікала-б у масе рабочых і сялян выбух непераможнага гневу. Ён ведае, што гэты гнеў выліўся-б ня толькі ў адны дэманстрацыі пратэсту.

Гарачыя яшчэ вогнішчы ў польскіх вёсках, зарава пажараў, якія зьнішчаюць маемасьць кулакоў, якія маюць сувязь з варшаўскімі ўладамі, служаць парукай гэтага.

Паставіўшы мэтай фізычнае зьнішчэньне рэвалюцыйных кадраў, польскія ўлады прабуюць правесьці гэта не адразу, а часткова, каб тым самым больш надзейна адбіць пратэсты пралетарыяту.

Да нас дайшлі падрабязнасьці катаваньняў палітзьняволеных у Горадзенскай турме, дзе заключаны 150 сялян з раёнаў Зах. Беларусі — цэнтру сялянскага рэвалюцыйнага руху.

7-га жніўня агенты «дэфэнзывы» (охранкі), узброеныя дубінкамі, зрабілі налёт на камэры, дзе знаходзіліся нашы таварышы. Правадыр гэтай банды загадаў нашым таварышом распрануцца. Апошнія зусім адмовіліся выканаць загад. Тады па сыгнале правадыра агентаў пачалося зьбіваньне палітзьняволеных. Нашы таварышы былі бязьлітасна зьбіты. Былі пушчаны ў ход рукаяткі рэвальвераў і прыклады вінтовак. Некаторыя з охранікаў былі ўзброеныя жалезнымі ламамі.

Калі нашы таварышы, якія абараняліся з надзвычайнай адвагай, змогліся і акрывэўленыя запаліліся з ног, іх пацягнулі ў турэмнае падзямельле. Там з іх сарвалі апошнія лахманы. Каб не прадаўжаць магчымыя дэманстрацыі пратэсту, улада выклікала ў турмы паліцэйскія падмацаваньні.

У гэты-ж дзень—7-га жніўня—[illegible] таварышы пачалі галадоўку. Аднак [illegible] лісты, атрыманыя іх сем'ямі, былі [illegible] ны 12 жніўня. Другіх вестак [illegible] было. 100 зьбітых зьняволеных [illegible] шаны былі пачаць галадоўку — [illegible] апошні сродак пратэсту.

Колькі з іх вытрымала гэта [illegible] выпрабаваньне?

Колькі памерла ад вычарпаньня [illegible]

Колькі задушана?

На гэтыя пытаньні ніхто ня [illegible] адказаць.

Пакуль што толькі відома, што [illegible] задушаны, 4 былі пры сьмерці, а [illegible] кі дзесятку пакалечана.

Цяпер міністар унутраных спраў [illegible] жае ў Варшаве дакладаў з Горадні і [illegible] эўрапейскіх сталін. Ад гэтых [illegible] на першыя вопыты катаваньняў [illegible] ньняволеных у Горадні залежыць [illegible] шы лёс 10 тыс. палітзьняволеных.

Іх лёс залежыць у першую чаргу [illegible] ступені актыўнасьці пратэсту [illegible] нага пралетарыяту.

Галадоўка ў Горадні — заклін [illegible] ньня для ўсіх працоўных сьвету.

Пан Пілсудзкі ўпаўнаважыў [illegible] паслоў даведацца аб грамадзкай [illegible] тых краін, дзе гэтыя паслы знаходзяцца. Мы ахвотна згаджаемся [illegible] «Сиятельные» каты хочуць [illegible] пачуцьці французскіх пралетараў. Што-ж? Яны атрымаюць [illegible]

ГАБРЫЕЛЬ ПЭРЫ.

Бегства сялян у СССР ня спыняецца

ФАШЫСЦКАЯ ЎЛАДА Ў ЗАМЯШАНЬНІ

З прычыны масавага ўцяканьня працоўнага сялянства Заходняй Беларусі з-пад улады акупантаў у свабодны Савецкі Саюз, фашысцкая прэса, асабліва віленская узьмела дзікую антысавецкую кампанію. Страціўшы галаву, фашысцкая ўлада, а па яе ўказаньні і фашысцкая прэса, пускаюцца на самую агідную правакацыйную хлусьню па адрасе СССР, абы толькі замазаць перад грамадзкай думкай усяго сьвету факт вялізарнай палітычнай важнасьці—адмаўленьне сялян ад сваёй зямлі, ад сваёй набытай вякамі маемасьці і потым з небясьпекай для свайго жыцьця пад градам фашысцкіх куль уцяканьне ў СССР. Для працоўных мас Савецкага Саюзу зразумелы тыя вялізарныя сымпатыі працоўных ня толькі Зах. Беларусі і Польшчы, але і ўсяго сьвету да першай у сьвеце пралетарскай дзяржавы, да яе сацыялістычнага будаўніцтва. Фашысцкая ўлада і яе продажныя пісакі шляхам розных выдумак і правакацыйных паклёпаў на СССР думаюць замазаць гэты факт. Але сярод іх панае такое вялікае замяшаньне, што яны на працягу аднаго дня пішуць розныя, зусім процілеглыя вэрсіі аб прычынах перабежкі. А гэта выдае іх з галавою.

Так, фашысцкая газэта «Жыцьцё Навагрудзкае» ў № 205 ад 27 жніўня адносна масавага ўцяканьня сялян з Польшчы ў СССР пісала наступнае:

«У апошні час заўважан, асабліва ў віленскім ваяводзтве, цэлы рад выпадкаў масавага пераходу граніцы з Польшчы ў Савецкую Расію. Гэта зьявішча тлумачыцца агітацыяй камуністаў, якія тут абяцаюць залатыя горы, а пасьля пераходу ня выконваюць ніякіх абавязацельстваў».

Да рэчы будзе тут прывесьці галасы пагранічных чытачоў па гэтым пытаньні. Пан Зз-зэ піша:

«З'агітаваная бальшавіцкімі агентамі беларуская моладзь прыляжаючых да граніцы вёсак ідзе цэлымі партыямі ўжо па некалькі дзесяткаў чалавек на бальшавіцкі бок.

Пераходзіць граніцу пачалі 2 тыдні назад. З пачатку ў адзіночку, потым партыямі па 20 чалавек, нават з коньмі, а цяпер ідуць яшчэ большымі партыямі (каля вёскі Вячэры і в. Таргуны).

Як даходзяць да нас весткі ад пагранічных жыхароў, бальшавікі сустракаюць уцекачоў вельмі ветліва і ўсіх заразжа высылаюць у Менск, не дазваляючы сустракацца з беларускім насельніцтвам, якое жыве на граніцы.

Уночы з пятніцы на суботу 22 жніўня наша паліцыя была папярэджана аб пераходзе значнай партыі з вёскі Таргуны. Партыя была затрымана на граніцы і пачала страляць у нашых салдат, у выніку чаго апошнія пусьцілі ў ход кулямёты, забіўшы на месцы трох чалавек і арыштаваўшы каля 15 чалавек, у тым ліку трох параненых. Іншыя паўцякалі. Двох з іх бачылі на возеры пры маёнтку Людзьвінава. Яны пыталіся, як прайсьці да в. Таргуны, дзе, як відаць, знаходзіцца адзін з бальшавіцкіх штабаў, кіруючы цэлай кампаніяй. Іншыя ўцекачы таксама накіроўваюцца да гэтай вёскі.

Ці вразумеюць тыя, хто пераходзіць граніцу, што іх дзеяньні зьяўляюцца здрадай дзяржаве,—ня ведаем, але цікава, якім спосабам уцекачы імкнуцца ўсыпіць пільнасьць польскага насельніцтва. Расказваюць яны, што «ідуць на работу».

Калі яны выходзяць, дык нават [illegible] разьвітваюцца з бацькамі. Яны выходзяць яусім ціха, бяз усякіх авантур, што вельмі дзіўна для нашай мясцовай вясковай моладзі, вядомай сваімі бойкамі на нажох на вясельлях. Мусіць тыціха і бяз шуму яны ідуць паводле інструкцыі.

Большая частка мясцовага насельніцтва і мабыць нашы мясцовыя ўлады [illegible] даценьваюць гэтых падзей. Чутны дзікі «няхай ідуць з богам, будзе ў [illegible] менш камуністаў». Многія, аднак, у [illegible] мяшаньні і ўсё часьцей задаюць [illegible] пытаньне — што гэта павінна значыць.

Працоўныя масы краіны Савецкага [illegible] чаць тыя жудасныя ўмовы, у якіх [illegible] ходзіцца жыць працоўным Зах. Беларусі пад акупацкай уладай. Да [illegible] даносяцца крыкі і енкі катаваных у [illegible] фэнзыўных засьценках і за турэмнымі [illegible] кратамі рэвалюцыйных барацьбітоў. [illegible] нас даносіцца гул крывавых карных экспедыцый, пры дапамозе якіх фашысцкая ўлада старацца задушыць рэвалюцыйнае [illegible] зваленчую барацьбу працоўных Зах. Беларусі і Зах. Украіны за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне. Сымпатыі працоўных Савецкага Саюзу на баку змагароў. Пралетары Савецкага Саюзу салідарны з працоўнымі Польшчы і Зах. Беларусі ў іх гераічнай барацьбе за зьвяржэньне фашысцкай дыктатуры, за зьвяржэньне ўлады акупантаў. Толькі Кастрычнік у Польшчы [illegible] жа вызваліць вас ад барбарскай эксплуатацыі, голаду і руіны.

С. Ж.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

„Чырвоная Зорка" — ШПАРКАСЬЦЬ І НАШСК камэдыя ў 8 частках. ЗВЫШ ПРАГРАМЫ: ТРЫМАЙ ЗЛОДЗЕЯ.
„КУЛЬТУРА" Пач. у 7; 8-45; 10-30 — Новы выдатны мастацкі бытавы фільм 2 МАТКІ 2 драма ў 6 частках.
„Інтэрнацыянал" Пач. 1 с. у 7 г. в. — МАСТАЦКІ ФІЛЬМ ПАЎНОЧНАЕ КАХАНЬЕ драма ў 7 частк. Звыш прагр. кіно-часоп. БДК № 14.
„Пралетары" Адкрыта з 12 г. дня — Мастацкі фільм з жыцьця вучонага і паэты ЛАМАНОСАВА СЫН РЫБАКА.
„Юны Піянэр" (будынак кіно „Культура") — Эпізод з грамадзянскай вайны ШАСНАЦЦАТЫ Пачатак сэансаў з 1 гадз.
„СПАРТАК" Пач. 6-30, 8, 9-30 і 11 Касе—з 5 гадз. — З 1 верасьня запежны баявік КАМІЛА Драма ў 6 частках.

МЕНСКІ ГАРФІНАДДЗЕЛ растлумачвае, што ЗАРПЛАТА ІНЖЫНЭРНА-ТЭХНІЧНЫХ РАБОТНІКАЎ абкладаецца падаходным падаткам у наступным парадку: пры даходзе да 500 р. у месяц падатак вылічваецца па агульна-устаноўленых стаўках для рабочых і служачых, пры даходзе ж звыш 500 р. у месяц абкладаньне утвараецца не прагрэсыўна, а прапарцыянальна — у памеры 3,5 проц. атрымліваемай імі пэнсіі. (Паст. ЦВК і СНК СССР ад 1-8-31 г.). Менга рфа.

4 верасьня, у 18, гадз., у памяш. БСНГ БССР (пакой № 1) прафэсар ЗМАЧЫНСКІ зробіць даклад на тэму: „Асновы пабудовы пяцігодкі ў сьвеце сучаснай фізыкі і хэміі". Для заслуханьня дакладу запрашаюцца: усе Менскія аб'яднаньні, Інстытут Прамысловасьці Дзяржплян і Наркамснаб.

АНОНС! СКОРА! Рыхтуецца да пастаноўкі вялікі мастацкі фільм паводле твораў М. ШОЛАХАВА ЦІХІ ДОН САЧЫЦЕ ЗА РЭКЛЯМАЙ! АНОНС!

Даводзіцца да ведамы кліентуры, што з 1/IX-31 г., згодна пастановы СПА ад 22/VIII-31 г. № 10545, УСЕГРУЗЫ, якія выгружаны ў склады станцыі, калі яны ня будуць вывезены на працягу 5 ДЗЁН СА ДНЯ ВЫГРУЗКІ, будуць абязьлічаны і ліквідаваны ў станоўленым парадку. Начальнік станцыі Менск.

Вытворчая практыка студэнтаў Менскіх Дзяржаўных Архітэктурнага і Дарожнага Будаўнічых Тэхнікумаў і Вячэрняга Рабочага Тэхнікуму, перайшоўшых на 2-гі і 3-ці курс, а для ВРТ-ра 2-гі, 3-ці і 4-ы курсы, пачнецца па 15-IX г. г. з 15-IX па 15-X — водпуск. З 15-X г. г. пачынаюцца акадэмічныя заняткі, да якога часу павінна быць у тэхнікуме. Студэнты 3-га выпускнога курсу (архітэктары і дарожнікі) павінны зьявіцца на заняткі і ліквідаваць тых, хто ня зьявіцца на заняткі ў вышэйпазначаныя тэрміны, будуць выключаны з ліку студэнтаў. (Дырэктар Тэхнікумаў Анодзін.

9-га верасьня г. г. пачынае сваю працу пашыраны пленум Цэнтральнага савету т-ва „ПРЭЧ НЯДІСЬМЕННАСЬЦЬ" з удзелам прадстаўнікоў райсаветаў т-ва „ПН". ПАРАДАК ДНЯ: 1. Уступнае слова старшыні ЦС Т-ва „ПН" тав. Чарвякова А. 2. Даклад Прэзыдыуму аб праробленай працы з часу апошняга пленуму (тав. Шастакоў). 3. Аперацыйны плян ліквідацыі нядісьменнасьці па БССР на 1931-1932 нав. г. і задачы т-ва „ПН" (тав. Сьцяпанюк). 4. Аб падрыхтоўцы да III-га зьезду. 5. Арганізацыйныя пытаньні. Дэлегаты на пленум (па адным з кожнага раёну) і члены ЦС Т-ва „ПН" забясьпечваюцца праездам, начлегам і харчаваньнем. ПРЭЗЫДЫУМ.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" — Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" з 5 верасьня адкрыта з 12 гадз. дня. На экране ПОЛА НЭГРЫ ў захопнай карціне КАЛЮЧЫ ДРОТ. Пачатак 1-га дзённага сэансу ў 2 гадз., 2-га—ў 3 г. 30 м. Пачатак вячэрніх сэансаў у 7, 8-40, 10-30. Каса адкрыта штодзённа з 12 гадз. дня. ЦЭНЫ на дзённыя сэансы ЗНІЖАНЫ.

БЕЛАРУСКІ ВЫШЭЙШЫ ПЭДАГАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ АБВЯШЧАЕ, ШТО ДА 10-га верасьня ПРЫМАЮЦЦА ЗАЯВЫ НА АСЕНЬНІ НАБОР ГАЗЭТНА-ВЫДАВЕЦКАГА адзяленьня літфаку, якое рыхтуе адказных літаратурных работнікаў друку і стыльредактароў для рэдакцый газэт і выдавецтваў. ЗАЯВЫ з дакумантамі, вызначанымі ў даведніку НКА, прымаюцца ў канцылярыі пэдінстытуту (Менск, Унівэрсытэцкі гарадок). Іспыты для тых таварышоў, якія ня маюць сярэдняй асьветы, будуць праводзіцца з 15 па 19 верасьня. Стыпэндыямі інтэрнатам забясьпечваюцца 70 проц. студэнтаў. ПАЧАТАК заняткаў—1-га кастрычніка. Дырэктар пэдінстытуту РУДНІЦКІ.

УСЕБЕЛКАНТОРА і МЕНСКАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ ДЗЯРЖБАНКУ ў апошні раз папярэджае ўсіх кліентаў, якія маюць кантакарэнты, што КАСАВЫЯ ПЛЯНЫ павінны штомесячна прадстаўляцца НЕ ПАЗЬНЕЙ 10 ЧЫСЛА прадпялнавага месяца. Пасьля 20 пляны прымацца на будуць і ўсякія выдачы наяўных грошай будуць спынены. Адначасова паведамляем аб сваячасовым прадстаўленьні касплянаў на IV квадру 1931 г. АДМІНІСТРАЦЫЯ.

Да ўвагі ўсіх камуністаў і камсамольцаў — ВЫХАРОЎ КАМУНАЛЬНЫХ ДАМОЎ па Маскоўскай № № 24, 32а і 14. 4 верасьня, у 5 гадз. дня склікаецца СХОД членаў КП(б)Б І ЛКСМБ, якія жывуць у паказаных вышэй домах. Яўка абавязкова ў парадку партдысцыпліны. Гарком КП(б)Б.

ШУКАЮ Аліфэровіча Радзіёна Рыгораві, зволенага з Чырвонай арміі ў 1926 г. у г. Слуцку. Асоб. хто ведае яго месцазнаходжаньне, прашу паведаміць па адрасе: пошта Жытнавічы, Пухавіч[illegible]

4 верасьня г. г. у 19 гадз. будуць падаваць гудкі сырэн, якія не абазначаю